НЯХАЙ ЖЫВЕ 1 МАЯ!

Ніва

ТЫДНЁВІК ГП БГКТ

№ 17 (896) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 29 КРАСАВІКА 1973 г. ЦАНА 60 гр.





Удзельніцы цэнтральнага агляду, якія заваявалі II месца ў катэгорыі дуэтаў, Ніна Мушынская і Надзея Парэмбская з Гарадка Беластоцкага павету.

Фота А. Карпюка.



* * *

Хто раней,
хто пазней,
Толькі ўсе
Зноў і зноў
Мы прыходзім
Да простых,
як хлеб і паветра,
Высноў:

Што жыццё чалавеку —
Любому —
Даецца адно,
І што,
як ні надточвай,
Кароткае вельмі яно,

І што праўда на свеце
Адна —
Без крупінкі маны,
І што шчасця на свеце
Няма
Без сваёй стараны...

Колькі б ты ні мудрыў,
Як ні кідаўся б ты,
А прыходзіш
Да гэтай святой прастаты.

І ўзыходзяць
Над лесам
Пражытых табою гадоў
Непагасныя зоркі
Законаў бацькоў і дзядоў.

Прарастаюць зярняты
Яшчэ невядомых навук
На шырокіх далонях
Натруджаных рук.

І нідзе
Не схавацца
Ад сынавых ясных вачэй.
І на свеце тады
Жыць
Намнога цяжэй
І лягчэй.

Генадзь Бураўкін



З МАЛОЧАК — ПРАЗ ЛЕНІНА — У БЕРЛІН



Ян Кочук.

Прысеўшы на вулічнай лавачцы, чакаў я Яна Кочука — жыхара вёскі Малочкі ў Боцькаўскай гміне на Бельшчыне. Рэкамендуючы яго асобу, гаварылі мне „ў павеце":

— Усю вайну ваяваў.

З такім чалавекам варта пазнаёміцца. Тым больш, што год 1973 у дзеях Людовага Войска Польскага з'яўляецца годам юбілейным. А гэтыя дзеі ўвайшлі ў біяграфію Яна Кочука, якому цяпер 55 гадоў і які па-даўнейшаму працуе на бацькоўскай гаспадарцы.

— Як вы трапілі ў Войска Польскае? — пытаю ў яго.

— У 1940 годзе мяне ўзялі як навабранца ў Чырвоную Армію, у якой я служыў да вясны 1943 года. Калі пачалі арганізоўваць у Сельцах на Ацэ I Дывізію імя Т. Касцюшкі, я быў адкамандзіраваны ў Войска Польскае, у якое кіравалі многіх чырвонаармейцаў, што паходзілі з даўнейшай Заходняй Беларусі, польскіх грамадзян.

На пацвярджэнне сваіх слоў Ян Кочук раскладае на стале свой дамашні архіў.

Праз мае рукі праходзяць пісьмовыя падзякі, віншаванні і пасведчанні на медалі, ордэны і крыжы. Ад імя Вярхоўнага Савета СССР і Краёвай Рады Нарадовай, ад імя Галоўнакамандуючага Савецкай Арміяй і Галоўнакамандуючага Людовым Войскам Польскім. За перамогу над фашысцкай Германіяй, за Варшаву, за Одру, Нысу і Балтыку, за Берлін і ўрэшце найважнейшы сярод гэтых дакументаў — пасведчанне аб прысваенні ордэна „Віртуці Мілітары" (5 класа), а таксама двух медаляў „Заслужаны на полі хвалы".

Лацінскія словы „Віртуці Мілітары" абазначаюць „салдацкую адвагу, славу і геройства". Крыж „Віртуці Мілітары" з'яўляецца найважнейшай вайсковай узнагародай у Польскай Арміі. Гэтым ордэнам пахваліцца могуць не многія грамадзяне нашай краіны.

— Гэта за ўдзел у баях на Одры і ў штурме на Берлін, — паясняе Ян Кочук.

— Што засталося ў вашай памяці з гэтых баёў?

— У раён Одры наш полк прабыўся

Працяг на стар. 4

БГКТ ХРОНІКА

■ Пленарнае пасяджэнне праўлення гайнаўскага аддзела БГКТ (8.IV) было прысвечана справам супрацоўніцтва аддзела з актывам. Старшыня аддзела Аляксандр Іванюк ў дакладзе моцна падкрэсліў ролю старшынь гурткоў БГКТ і настаўнікаў беларускай мовы ў дзейнасці Беларускага таварыства. Шмат увагі прысвяціў ён развіццю мастацкай самадзейнасці, у тым ліку конкурсу на беларускую песню, а таксама ролі БГКТ, яго членаў у павелічэнні сельскагаспадарчай вытворчасці, ўдзелу ў ваяводскім конкурсе „Беластоцкая вёска — гаспадарная і культурная". Затым дакладчык запрапанаваў разгледзець магчымасці адносна ўтварэння пакуль што аднаго гміннага праўлення БГКТ. Пасля абшырнай дыскусіі пленум пастанавіў 1) арганізаваць два разы ў год нарады старшынь гурткоў БГКТ, 2) адзін раз — нараду настаўнікаў беларускай мовы, 3) прыдзяліў членаў праўлення да паасобных гурткоў БГКТ, каб дапамаглі ім у працы і ў зборцы членскіх складчын, 4) зацвердзіў раней падрыхтаваны праект плана працы аддзела з нагоды святкавання 30-ай гадавіны Войска Польскага, у якім прадбачана арганізаваць акадэміі, сустрэчы з афіцэрамі Войска Польскага, удзельнікамі II сусветнай

(Працяг на стар. 3)

ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У „НІВЕ"

Фотарэпартаж з фінальнага розыгрыша конкурсу „Што ведаеш аб Савецкім Саюзе" ● Літаратурная старонка ● Уладзімір Германюк з Доўгага Броду (Гайнаўшчына) успамінае вайну ● Аб шанцах для сялян расказваюць журналісту маладыя гаспадары Мілейчыцкай гміны ● Пра даўніх нараўскіх арэляў ● Да чаго даводзіць несправядлівасць ● Аб адной з буйнейшых школ Мінска ● Весткі з Крушыньян, Пашкоўшчыны, Спічкаў і Каралёвага Мосту ● Папулярная савецкая песня „Сіні лён".



Сухавольцы вёска гаспадарная і культурная.



Сухавольцы з'яўляюцца адной з найпрыгажэйшых вёсак у Гайнаўскім павеце. Мураваныя дамы з ганкамі, каляровыя жалезныя парканы паабапал шасейнай дарогі з Бельска ў Кляшчэлі. Усе яны прыгожыя, быццам падрыхтаваныя на выстаўку. У конкурсе „Беластоцкая вёска — гаспадарная і культурная" Сухавольцы занялі калектыўна першае месца і атрымалі 100 тыс. злотых узнагароды. Да гэтага конкурсу рыхтаваліся ўсе мясцовыя жыхары. Дзякуючы іх супольным намаганням

(Працяг на стар. 4)



◇ Падзеі ◇ Здарэнні ◇ Факты ◇ Каментарыі ◇ Весткі



ВЫСТУПЛЕННЕ Г. ГУСАКА

У выступленні, якое апублікавала чэхаславацкая прэса, Генеральны сакратар ЦК КПЧ Г. Гусак заявіў, што за кароткі тэрмін — чатыры гады — Камуністычная партыя Чэхаславакіі пры падтрымцы мільёнаў працоўных дабілася таго, што чэхаславацкае грамадства жыве цяпер у спакойнай абстаноўцы і можа вырашаць канкрэтныя праблемы. Каб ліквідаваць хаос у грамадскай і эканамічнай галінах, пераадолець знешнепалітычную ізаляцыю, блакаду, якую стварыў вакол Чэхаславакіі так званы заходні свет, неабходна было весці рашучую палітычную барацьбу перш за ўсё з падрыўнымі сіламі ўнутры краіны, з сіламі рэвізіянізму і адкрытую барацьбу з контррэвалюцыйнымі сіламі, якія стварыліся ў Чэхаславакіі.

Цяжкія гады, цяжкая барацьба ўжо ззаду, гаварыў Г. Гусак. Нядаўняе мінулае паслужыла для нас урокам, мы не сыдзем з марксісцка-ленінскага шляху і будзем цвёрда весці нашу партыю, нашу грамадства па гэтаму шляху.

НАМЕРЫ ІЗРАІЛЯ

Па даручэнню сваіх урадаў прадстаўнікі раду краін пры ААН накіравалі генеральнаму сакратару ААН К. Вальдхайму пісьмо, у якім звяртаюць яго ўвагу на паведамленні аб намеры ізраільскага ўрада дазволіць грамадзянам Ізраіля на набыццё зямель на акупіраваных тэрыторыях. У пісьме гаворыцца, што гэтыя планы нельга разглядаць інакш, як у цеснай сувязі з агульнай палітыкай Ізраіля, накіраванай на канчатковае далучэнне захопленых зямель да Ізраіля.

КАТАСТРОФА

У выніку сутыкнення з рэактыўным самалётам амерыканскіх ваенна-марскіх сіл загінуў самалёт-лабараторыя Нацыянальнага ўпраўлення па аэранаўтыцы і даследаванню касмічнай прасторы ЗША (НАСА). Пры сутыкненні самалёта і лабараторыі загінула 16 вучоных, тэхнічных спецыялістаў і членаў экіпажа. Сутыкненне адбылося пры падлёце да аэрадрома ваенна-марскіх сіл Мофет-Філд у Каліфорніі.

Камандуючы авіяцыяй флоту на Ціхім акіяне паведаміў, што катастрофа, „відаць, была выклікана чыёйсьці памылкай".

НА ФОНД ДАПАМОГІ ДРВ

Актывісты Саюза люксембургскіх жанчын сабралі больш 130 тысяч франкаў на фонд дапамогі Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам.

ВУЧАЦЦА І ПРАЦУЮЦЬ

За апошнія гады на Кубе адкрыта некалькі дзесяткаў так званых „школ у полі". Вучні старэйшых класаў спалучаюць вучобу з штодзённай трохгадзіннай працай на бананавых плантацыях, у цытрусавых садах, агародніных гаспадарках.

Запланавана пабудаваць 26 палітэхнічных школ у суседстве прадпрыемстваў, якія будуць выкарыстаны як навуковая база. На пачатку будучага школьнага года першыя такія школы распачнуць працу. Усяго ў іх зможа вучыцца 13.500 чалавек. Большасць школ будзе пабудавана каля фабрык цукру. Тут будуць рыхтаваць будучых апаратараў, механікаў, зваршчыкаў, лабарантаў. (ак)

ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ

У калгасе імя XXII з'езду КПСС у Гомельскім раёне, дзе старшынёй Герой Сацыялістычнай Працы Н. П. Хаванскі, рашылі змагацца за атрыманне 40 цэнтнераў збожжавых і 220 цэнтнераў бульбы з аднаго гектара.

Масавая пасадка бульбы пачалася ўжо таксама ў гаспадарках Любанскага раёна. У калгасе „Беларусь" звяно механізатара Уладзіміра Астрэйкі абавязалася вывесці аж па 500 цэнтнераў клубняў на кожным з 75 гектараў. Такога ж ураджаю рашыла дабіцца звяно братоў Івана, Уладзіміра і Сцяпана Вярэнікаў у саўгасе „Каліпаўка".

Падобныя паведамленні паступаюць кожны дзень з многіх іншых гаспадарак БССР.

РАШЭННІ ПАРТЫІ

У Дырэктывах XXIV з'езду КПСС сказана: „Пабудаваць і ўвесці ў дзеянне... Магілёўскі шаўковы камбінат".

І вось пасля двух гадоў будовы ў строй дзеючых уваходзіць першая чарга гэтага камбіната, які разлічаны на выпуск 110 мільёнаў квадратных метраў тканін у год. Для параўнання варта ведаць, што Віцебскі шаўковы камбінат выпускае ў год 18 млн. квадратных метраў тканін. Магілёўскі тэкстыльны камбінат будзе самы буйны ў Савецкім Саюзе.

БЕЛАРУСКАЯ КНІЖКА

На кніжнай выстаўцы ў Маскве паказана было 982 кніжкі з розных саюзных рэспублік. Высокую ацэнку атрымалі беларускія выданні. Аж 14 беларускіх кніжак адзначаны былі конкурсны́мі ўзнагародамі. Дыплома першай ступені ўдастоены V і VI тамы „Беларускай Савецкай Энцыклапедыі" і сувенірныя выданні выбраных твораў Янкі Купалы, якія афармляў мастак Барыс Забораў, а таксама творы Якуба Коласа, пры якіх папрацаваў мастак Васіль Шаранговіч. Дыпломамі II ступені адзначаны былі выданні твораў П. Броўкі, А. Куляшова, М. Танка і іншыя.

АГЛЯД ФІЛЬМАЎ

Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР і кінематаграфіі супольна з Саюзам кінематаграфістаў БССР правялі ў Мінску цікавы агляд фільмаў, выкананых творчымі калектывамі кінастудыі „Беларусьфільм" у мінулым годзе. На агляд былі запрошаны рабочыя мінскіх прадпрыемстваў, студэнты, журналісты і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Пасля агляду яны запаўнялі спецыяльныя анкеты, на аснове якіх вылучаўся лепшы фільм мінулага года.

Пры нагодзе варта ведаць, што „Беларусьфільм" у 1972 годзе выпусціла адзінаццаць мастацкіх тэлевізійных фільмаў, ды больш як 80 дакументальных і навукова-папулярных кінастужак.

НА СЦЭНАХ

Акадэмічны тэатр оперы і балету БССР паказаў прэм'еру балету „Бахчысарайскі фантан" Б. Асаф'ева (лібрэта М. Волкава па паэме А. Пушкіна).

Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі паставіў аперэту „Пацалунак Чаніты" Ю. Мілюціна.

Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр паказаў прэм'еру камедыі „Таблетку пад язык" А. Макаёнка. (вр)

УЖО 28 ГОД

Ва ўсіх гарадах краіны ўрачыста адзначалася 28 гадавіна падпісання польска-савецкага дагавору аб дружбе, узаемадапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве. Значэнне гэтага дагавору спраўдзілася ў жыцці нашай краіны, у супрацоўніцтве, якое дае карысці абедзвюм краінам.

З нагоды 28-ай гадавіны падпісання дагавору перад камерамі польскай тэлевізіі выступіў член Палітбюро, сакратар ЦК Эдвард Бабюх і пасол СССР у Польшчы — Станіслаў Пілатовіч. Потым адбыўся ўрачысты канцэрт.

Таксама ў Маскве, Мінску і іншых гарадах Савецкага Саюза гадавіна гэта адзначалася вельмі ўрачыста.

„ІНТЭРКОСМАС — КАПЕРНІК 500"

У рамах супольных даследаў сацыялістычных краін над космасам, па праграме „Інтэркосмасу" праведзен польска-савецкі сатэлітарны эксперымент. Менавіта запушчан на арбіту спадарожнік „Капернік—500" з польскай навуковай апаратурай. Яго заданне — правесці шырокія і разнародныя даследы сферы вакол Сонца.

ВЫНІКІ ПЕРШАГА КВАРТАЛА

Палітбюро ЦК ПАРП і Прэзідыума ўрада ПНР на супольным пасяджэнні разгледзелі гаспадарчыя вынікі першага квартала бягучага года. Было сцверджана, што вынікі гэтыя наогул добрыя. Перш за ўсё утрымліваецца высокая дынаміка прамысловай прадукцыі, якая ўзрасла на 11,2% у параўнанні з першым кварталам мінулага года.

На пасяджэнні былі сцверджаны і недахопы. Найважнейшы з іх гэта тое, што некаторыя прамысловыя прадпрыемствы не выконваюць сваіх планаў.

У 30-УЮ ГАДАВІНУ ПАЎСТАННЯ Ў ГЕЦЕ

У сувязі з 30-ай гадавінай паўстання ў Варшаўскім геце адбыўся ў Варшаўскай філармоніі ўрачысты канцэрт, арганізаваны Агульнапольскім камітэтам фронту адзінства народу, ЗБоВіД-ам і Яўрэйскім грамадска-культурным таварыствам у Польшчы.

600 ТЫСЯЧ МЕСЦ

Ідуць запісы моладзі ў сярэднія школы. Падрыхтавана 600 тысяч месц. Палічана колькасць месць у поўных сярэдніх школах: агульнаадукацыйных ліцэях і чатырохгадовых прафесіянальных ліцэях, якія будуць навучаць кваліфікаваных рабочых з матурай.

ПАРТЫЙНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў ШЛЁНСКАЙ ВАЙСКОВАЙ АКРУЗЕ

У Вроцлаве адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя ПАРП Шлёнскай вайсковай акругі. Удзельнічаў у ёй член Палітбюро, прэм'ер Пётр Ярашэвіч. Галоўнай тэмай было фарміраванне грамадзянскай свядомасці ў салдатаў.

ЗА ЧЫСЦІНЮ І ГАСПАДАРНАСЦЬ

„Трыбуна люду" — орган ЦК ПАРП вядзе на сваіх старонках пастаянную вялікую акцыю пад загалоўкам: „Ад чысціні да гаспадарнасці". Публікуюцца тут добрыя прыклады, калі прадпрыемствы і людзі жывуць у згодзе з чысцінёй, і вострыя крытычныя прыклады, калі на будовах, у месцах працы, і ўвогуле вакол нас пануе бруд і балаган. (вл)

УРАЧЫСТЫ КАНЦЭРТ

20 красавіка ў Беластоку, у зале ТППР, адбыўся ўрачысты канцэрт, прысвечаны 28-ай гадавіне падпісання польска-савецкага Дагавору аб дружбе, узаемадапамозе і супрацоўніцтве. На канцэрце прысутнічалі прадстаўнікі ваяводскіх і гарадскіх улад, дэлегацыі грамадскіх і маладзёжных арганізацый, прадстаўнікі беластоцкіх прадпрыемстваў і ўстаноў. У канцэрце выступілі пераможцы конкурсу савецкай песні.

У ПАМЯЦЬ ПАЎСТАНЦАЎ

19 красавіка, у трыццатую гадавіну паўстання ў варшаўскім геце, грамадскасць Беласточчыны таксама ўшанавала памяць загінуўшых. Дэлегацыі Ваяводскага і Гарадскога камітэтаў Фронту адзінства народа, ЗБоВіД, прадстаўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў, школьная моладзь склалі вянкі і кветкі пад памятнай таблічкай па вул. Весялоўскага, па вул. Мальмеда і на магілках змагароў гета.

НЯДЗЕЛЯ ПРАЦЫ

Нядзеля, 15 красавіка, была аб'яўлена Ваяводскім праўленнем ЗМС у Беластоку нядзеляй працы грамадскім чынам. Моладзь ЗМС з усяго ваяводства працавала пры ўпарадкаванні пляцаў вакол школ і прадпрыемстваў, будавалі і напраўлялі дарогі, упарадкоўвалі скверы. Сельская моладзь працуе ўжо некалькі тыдняў, выконваючы заданні ЗСМВ пад лозунгам „Вясна чынаў". Напрыклад, у Міклашах моладзь будуе святліцу, у Орлі — рамантуе святліцу, гайнаўская моладзь садзіць лес, рамантуе дарогу з Чарэмхі да Зубачоў і г.д.

ПРАЦА Ў ПОЛІ

Раней, чым у мінулыя гады, пачаліся на Беласточчыне палявыя работы. Спраўна і хутка праходзіць сяўба яравых. На 16 красавіка план сяўбы яравых выкананы быў ужо ў 80%. Ідзе пасадка цукровых буракоў, а ў паўднёвых паветах ваяводства ўжо пачалася пасадка бульбы.

РАНЕЙ ТЭРМІНУ

Будаўнікі цукроўні ў Лапах дабіліся незвычайных вынікаў у працы — за вельмі кароткі час паставілі першы з чатырох рэзервуараў на цукар. Асабліва добра працавалі брыгады майстроў М. Вішнеўскага і К. Жура, а таксама ОГП.

НАБОР У ШКОЛЫ

Пачаўся ўжо набор моладзі ў сярэднія і прафесіянальныя школы. У ліцэях, тэхнікумах і прафесіянальных школах дакументы будуць прымацца да 20 мая. Уступныя экзамены адбудуцца перад 20 чэрвеня. Без экзаменаў будуць прыняты ўсе выдатнікі і фіналісты алімпіяд, а таксама ўсе паступаючыя ў тыя школы, дзе колькасць ахвотных не будзе большая, чым колькасць месц.

НА ФОНД АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

У нашым ваяводстве за I квартал на Фонд аховы здароўя ўплачана 14 млн. зл. Яшчэ ў гэтым годзе будуць пабудаваны пункты аховы здароўя ў вёсках Гаць і Вонсаш, яслі ў Беластоку і бальнічны павільён у Гайнаўцы. (яч)



Niedziela — 29.IV

7.30 Program dnia. 7.35 TV Kurs Rolniczy. 8.10 Przypominamy, radzimy. 8.20 Alarm przeciwpowodziowy trwa. 8.30 Nowoczesność w domu i zagrodzie. 9.00 Teleranek. 10.20 Antena. 10.35 Z serii „Świat, który nie może zaginąć" — „Ogrodzenie". 11.00 W starym kinie: „Wczesne komedie Chaplina". 12.00 Sportowy Magazyn Sprawozdawczy: mecz piłki nożnej o mistrzostwo I Ligi „Gwardia" (Warszawa) — Górnik (Zabrze). 14.00 Dziennik. 14.15 Przemiany. 14.45 Losowanie Totolotka. 15.00 Dla młodych widzów: Finał XIV Olimpiady Wiedzy o Polsce i Świecie Współczesnym. 16.00 Encyklopedia tatrzańska. 16.25 Kubańskie rytmy w warszawskiej „Stodole". 17.00 Z cyklu: „Znaki zapytania" — „Wilczy szaniec". 17.55 Estrada Literacka — Jarosław Iwaszkiewicz — „Kłosy pochylone". 18.40 PKF. 18.50 „Serce o zmierzchu" — program rozrywkowy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Linoskoczki" z serii „Wielka miłość Balzaka" cz. VI telew. filmu prod. polsko-franc. 21.05 PKF. 21.15 „Znasz li ten kraj..." — drugi program z Jaszowca. 22.00 Magazyn sportowy.

Poniedziałek — 30.IV

12.45 TV Technikum Rolnicze — Matematyka. 13.25 TV Technikum Rolnicze — Uprawa roślin. 15.20 Politechnika TV — Kurs przygotowawczy. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Zwierzyniec. 17.30 Echo stadionu. 17.55 TV Kurier Białostocki. 18.10 Oferty. 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 Magazyn Postępu Technicznego. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Teatr Telewizji: „Dokument liryczny", wg powieści M. Gorkiego „Matka". 21.25 „Ludziom pracy" — program estradowy. 22.25 Dziennik.

Wtorek — 1.V

7.35 Program dnia. 7.45 Dziennik. 7.55 Sprawozdanie z manifestacji 1-Majowych w Moskwie. 8.55 „Oto nadszedł maj uroczy" — program poetycko-muzyczny. 9.55 Sprawozdanie z manifestacji 1-Majowych w Warszawie, w kraju i w krajach socjalistycznych. 14.00 Dla dzieci: „Złote wrota" — teatrzyk piosenki dziecięcej TV Słowackiej w Koszycach. 14.50 Utwory Chopina gra Barbara Hesse-Bukowska w Żelazowej Woli. 15.10 Wiosenna estrada — radziecki program rozrywkowy. 15.55 Estrada Poetycka — Władysław Broniewski — „Wisła". 16.40 Występ Państwowego Zespołu Pieśni i Tańca „Śląsk". 17.20 Reportaż. 18.00 Sprawozdanie z międzynarodowego mittingu lekkoatletycznego ze stadionu „Skry" w Warszawie. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Rewia z Teatru Wielkiego w Łodzi „Dobry wieczór — tu Łódź". 21.15 „Złote wesele" — fab. film prod. CSRS. 21.45 Wiadomości sportowe.

Środa — 2.V

8.20 „Linoskoczki" z serii „Wielka miłość Balzaka", odc. VI. 9.55 Dla szkół: Nauka o człowieku — kl. VIII — Sprawy 15-latków. 10.55 Dla szkół: Wychowanie plastyczne — kl. VII—VIII — Architektura współczesna. 11.55 Dla szkół: Fizyka — kl. VIII — Prąd elektryczny w gazach. 12.45 TV Technikum Rolnicze — Botanika. 13.25 TV Technikum Rolnicze — Hodowla zwierząt. 14.00 Wybieramy zawód. 15.20 i 23.00 Politechnika TV — Kurs przygotowawczy. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodych widzów: Latający Holender — „Szkoła Jungów 2000". 17.10 Dla dzieci: „Lalka Pelunka na wycieczce" — program TV Czeskiej. 17.30 Informacje — Towary — Propozycje. 17.50 Sylwetki X Muzy — Anna Milewska. 18.20 TV Kurier Warszawski. 18.40 Polityka dla wszystkich. 19.10 Przypominamy, radzimy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Gorzkie szczęście" — odc. III filmu „Cienie zanikają w południe" prod. radz. 21.25 Świat i Polska. 22.05 „Echo w lesie" — opera komiczna w I akcie. 22.35 Dziennik. 22.50 Wiadomości sportowe.

Czwartek — 3.V

9.40 „Gorzkie szczęście", odc. III z serii „Cienie zanikają w południe" prod. radz. 10.55 Dla szkół: — Język polski kl. III lic. — Wydarzenia sezonu teatralno-telewizyjnego. 12.45 Dla szkół: Język polski — kl. VII — Historia książki. 14.00 Matematyka w szkole — Funkcje, równania i nierówności. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Ekran z bratkiem" 17.45 PKF. 17.55 Program rozrywkowy. 18.25 TV Kurier Mazowiecki. 18.45 Program publicystyczny. 19.10 Przypominamy, radzimy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Teatr Sensacji: Jerzy Janicki „AKCJA V" — odc. I — „W połowie drogi". 21.10 Program publicystyczny. 21.40 Ekspres nr 25. 22.10 Dziennik. 22.25 Wiadomości sportowe. 22.35 TV Technikum Rolnicze — Botanika. 23.10 TV Technikum Rolnicze — Hodowla zwierząt.

Piątek — 4.V

8.30 „Ostatni raj na ziemi" — włoski film dokum. 9.55 Dla szkół: Geografia — kl. VI — „Nad Bałtykiem". 10.25 Filmy dokumentalne. 10.55 Dla szkół: Wychowanie obywatelskie — kl. VIII — Między nami sąsiadami". 11.55 Dla szkół: Przysposobienie obronne — kl. III lic. „Żołnierska rzecz". 12.45 TV Technikum Rolnicze — Matematyka. 13.25 TV Technikum Rolnicze — Mechanizacja Rolnictwa. 15.20 i 23.10 Politechnika TV — Kurs przygotowawczy. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Pora na Telesfora". 17.25 Nie tylko dla pań. 17.50 Recital wokalny Urszuli Trawińskiej. 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 Magazyn oświatowo-wychowawczy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Bez przerywników" — włoski program rozrywkowy. 20.55 Panorama. 21.35 Teatr Telewizji — William Saroyan — „Moje serce jest w górach..." 22.45 Dziennik. 23.00 Wiadomości sportowe.

Sobota — 5.V

8.30 Filmy z Gretą Garbo: „Zuzanna Lenox". 9.55 Dla szkół: Geografia — kl. V — W śląskim planetarium. 10.55 Dla szkół: Nauka o człowieku — kl. VIII — Sprawy 15-latków. 14.20 TV Technikum Rolnicze — Matematyka. 14.55 TV Technikum Rolnicze — Mechanizacja rolnictwa. 15.25 Program dnia. 15.30 Program I proponuje. 15.50 Redakcja Szkolna zapowiada. 16.05 TV Informator Wydawniczy. 16.30 Dziennik. 16.40 Teatr Młodego Widza — Scena Faktu: „Młodość, miłość, małżeństwo". 17.40 Z kamerą wśród zwierząt. 18.10 Turystyka, wypoczynek, rekreacja. 18.35 Pegaz. 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 Studio 13. 20.25 Dziennik. 21.40 Wiadomości sportowe. 21.45 Filmy z Gretą Garbo: „Zuzanna Lenox". 23.00 Program rozrywkowy.

ТЭЛЕВІЗІЯ МІНСК

Piątek, 27 kwietnia

9.30 Szkoła szachowa. 10.00 Filmy dokument. 14.15 Program dnia. 17.00 Film animowany. 17.40 Film dokument. 18.40 Koncert. 19.00 Czas. 19.30 Opera komiczna. 20.50 Program sportowy.

Sobota, 28 kwietnia

8.40 Opera komiczna. 14.15 Program dnia. 14.45 Bajka dla dzieci. 16.10 Koncert. 17.00 Piłka nożna. „Dynamo (Mińsk) — „Ararat" (Jerywań). 19.00 Czas. 19.30 Teatr miniatur. 20.20 Moda i my. 21.00 Koncert. 21.35 Panorama nowin.

Niedziela, 29 kwietnia

7.00 Program dnia. 8.00 Dla żołnierzy. 8.30 Kiosk muzyczny. 9.30 Almanach TV. 12.45 Hokej. CSKA — SKA (Leningrad). 15.00 Klub filmowy. 16.10 Filmy animowane. 17.50 Film seryjny. „Wielka przemiana". I cz. 19.00 Czas.

ТАМ, ДЗЕ ПЛЕШЧАЦЦА ФАРЭЛЬ

Пад стромкімі белакорымі бярозамі блакітнымі вачанятамі глядзяць праляскі на прамяністае красавіцкае сонейка. Мядовым пахам поўнаць наваколле аблітыя ружовым квецтем кусты воўчага лыка. У празрыстую тонь сажалак заглядаюць вышэзныя кашлатыя елкі і ціха, на высокім белым падмурку, драўляны дом. А ў крынічнай вадзе сажалак плешчацца срабрыстая фарэль...

Шыльда над брамай не пакідае сумненняў: перад намі ўладанні Польскага рыбалавецкага саюза, садок для развядзення фарэлей або інакш — папулярная ў мястэчку Супраслі і яго ваколіцах „пстрангарня".


Пастаянны яе жыхар і наглядчык за сажалкамі Чэслаў Жукоўскі — чалавек улюбёны ў рыбу і размоўны. Вядзе ў падмурак дому, дзе абсталяваны спецыяльны інкубатар для вывядзення з ікры малькоў фарэлей. У прасторным і глыбокім бетонным жолабе рыхтуюцца да „развязкі" мажныя 2—3-кілаграмавыя самкі і значна меншыя ад іх 0,5—1-кілаграмавыя самцы. Кружаць у халоднай вадзе і неахвотна горнуцца да ежы. Непадалёку ад жолаба, у металічных скрынках, праз якія няспынна працякае крынічная вада, ляжаць дзесяткі тысяч жаўтаватых ікрынак, кожная велічынёй з малую гарошыну. Праз некалькі дзён з іх павінны выйсці рухлівыя малькі памерам у адзін сантыметр. А побач стаяць такія ж скрынкі з выведзенымі малькамі. Мройным воблачкам абступілі яны кавалачак мармуру. Здагадваюся, што на адпаліраванай затопленай у вадзе мармуровай паверхні знаходзіцца нейкая ежа.

— Чым жа вы корміце гэтыя малечствы?

— О, фарэльчаняты — пераборлівыя стварэнні. Ядуць яны толькі молатую селязёнку, вымешаную з жаўтком курынага яйка. Падаецца ім гэты спецыял кожныя дзве гадзіны, безупынна дзень і ноч. — Хоць і малыя, але апетыту ім толькі пазайздросціць, — усміхаецца Ч. Жукоўскі. — А потым, як падрастуць, вантробаю іх кормім. Калі ж ужо стануць велічынёй са складаны ножык, жывім іх рознымі мяснымі адпадкамі, камбікармамі, вараным зернем бабовых раслін.

Заўважаю, што „пстрангарня" мае не так ужо многа сажалак для адкормкі фарэлей на таварную рыбу.

— Бо мы ў асноўным займаемся вырошчваннем малькоў фарэлей, — паясняе мой размоўца. — Штогод выводзім іх каля 300 тысяч штук, з гэтага сабе пакідаем каля 10 тысяч штук на гадоўлю матак і млечакоў ды крыху на продаж. Малькі з нашага садка вандруюць у спецыяльных кантэйнерах не толькі ў другія рыбалавецкія гаспадаркі, самыя чыстыя рэчкі і азёры Беласточчыны, але і ў іншыя рэгіёны нашай краіны. На рынак жа пастаўляем каля тоны фарэлей у год.




— А калі яна бывае ў продажы?

— На жаль, у рыбных крамах Беласточчыны вы яе не знойдзеце. Гэтую смачную, але і дарагую рыбу забірае ў нас Варшава. Яна ідзе ў шпіталі для цяжка хворых, а частка трапляе таксама ў сталічныя рэстараны вышэйшых катэгорый.

— І даўно тут знаходзіцца „пстрангарня"?

— Гадоў каля дваццаці пяці, — прыгадвае Ч. Жукоўскі. — Ужо пры народнай уладзе рыбалавецкі саюз яе пабудаваў. Месца надта ж адпаведнае: тут у сажалках б'е аж 48 крыніц! А перад вайной дык такая крэкаць была, што і носа не ўбіць. Толькі тут, на лузе, крыху разуха расла. Усё гэта пану Кавеліну належала. Памятаю, я бацьку свайму памагаў тут сена рабіць. Па пояс у рудой вадзе прыходзілася лазіць. Капічкі на насілках выносілі. А рабілі сена так: палавіна ішла пану, а палавіна нам...



Ч. Жукоўскі приступае да нарыхтоўкі спецыяльнага меню сваім прагаладаўшымся выхаванкам. А яны — срэбрабокія — плешчуцца ў блакітнай крынічнай вадзе. Грэе прамяністае красавіцкае сонца. З навакольнага лесу цягне мядовым пахам воўчага лыка.

Мікалай Гайдук
Фота аўтара

ЧЫМ БУДЗЕ ГМІННЫ ЦЭНТР КУЛЬТУРЫ?

Узнікненне гмін стварае запатрабаванне на новы мадэль культуры. Зразумела, найважнейшым у гэтым мадэлі будзе гмінны культурны цэнтр.

Беласточчына мае ўжо нейкі вопыт у працы грамадскіх цэнтраў культуры, якіх да канца 1972 года працавала ў ваяводстве 49.

Цяпер ставіцца такая задача: гмінны цэнтр культуры павінен быць у кожнай гміне. Ясна, што задача гэта не на год і нават не на пару год. Ніхто не паверыў бы нашым словам, калі б мы гаварылі, што за пару год у кожнай гміне будуць створаны гмінныя цэнтры культуры, якія ў далейшым коратка будзем зваць — ГОК-амі.

Фармальна ўзяўшы, можна было б стварыць ГОК-і ў кожнай гміне, але ці пра фармальнасць ідзе рэч ці пра рэчаіснасць? Рэч ідзе пра развіццё сапраўдных гмінных цэнтраў культуры — паўнацэнных і высокаідэйных. Толькі такія цэнтры культуры будуць рассяваць на ўсю гміну святло ведаў і культуры.

У такім, нарысаваным у нашых жаданнях ГОК-у, павінна абавязкова быць: вялікая глядзельная зала прынамсі на 300 месц, прасторная, добра забяспечаная рознымі кніжкамі бібліятэка з адпаведнай вялікай чытальняй, культурная кавярня з газетамі і часопісамі, пакоі для працы розных калектываў, якія павінны і будуць працаваць пры гмінным цэнтры культуры; на панадворку пры ГОК-у ў адпаведным месцы павінна знаходзіцца спартыўная пляцоўка, басейн.

Вось прыклад ГОК-у, які хочам мець. І гэткі мадэль гміннага цэнтра культуры будзе ў будучым рэалізавацца, ніякі іншы. Праз 5—10 год ужо жыццё будзе вымагаць ад нас пашырэння нават гэтакага мадэлю. Таму ўжо цяпер трэба думаць нам пра год 1985 і далей.

Гмінны цэнтр культуры мае прыцягваць наватарствам, цікавымі формамі працы, а таксама быць зародкам для вясковых клубаў і святліц, якія будуць працаваць на тэрыторыі данай гміны.

Даходзіць да такога, які мы накрэслілі, мадэлю будзем двума спосабамі: першы і найважнейшы спосаб — гэта інвестыцыі ў культуры — трэба будзе будаваць гмінныя цэнтры культуры. Але не адразу, не цяпер, не на пажар. У гэтай пяцігодцы не будуць будавацца новыя ГОК-і. Таму прыдаецца значэнне другому спосабу, які называецца грамадскім чынам і адаптацыяй адпаведных будынкаў. Зразумела, з гэтым трэба быць асцярожным і трэба добра падумаць, каб зрабіць першы крок. Ініцыятыва такой адаптацыі павінна выйсці ад мясцовага гміннага актыву, бо на мясцовых чынах яна будзе абапірацца. Прыклады другога спосабу ўжо маем. Вось Кнышын — сядзіба гміны звярнуўся да ваяводства з просьбай памагчы ім адаптаваць вялікі будынак на ГОК. Калі гмінныя ўлады і начальнік гміны Кнышын бачыць патрэбу такога чыну і падтрымае ініцыятыву і яе сэнсоўнасць, то можна будзе пачаць адаптацыйную інвестыцыю. Абы толькі яна ішла ў пары з узднім культурнага ўзроўню ў гміне. Адным словам, каб інвестыцыйным пачынанні ўсюды былі вынікам культурных патрэб і патрэбы гэтыя яшчэ больш радзілі.

Вера Леўчук

Міжнародны клуб дружбы

У мінулым годзе пры бельскім праўленні Саюза сацыялістычнай вясковай моладзі (ЗСМВ) утварыўся міжнародны клуб дружбы. Мэта яго — дапамагаць наладжваць кантакты з моладдзю замежных краін. Члены гэтага клуба абавязаны весці перапіску не менш як з 2 асобамі. Ужо клуб налічвае каля 50 членаў. Аддзелы клуба існуюць у Беластоку, Лапах і Бранску. Старшынёй клуба з'яўляецца Веслаў Сакоўскі — старшыня гуртка ЗСМВ з вёскі Хаева, што на Бельшчыне. У планах клуба на бягучы год прадбачана запрасіць на Беласточчыну 5 асоб з Чэхаславакіі, а пазней паехаць туды з рэвізітам. (мх)

Этнаграфічная акенца



Жаночы камплект з Сакольшчыны (Этнаграфічны музей ў Торуні).

Пачатак на стар. 1

БГКТ хроніка

вайны, конкурсы ў гуртках БГКТ на насценгазеты, паказваць савецкія фільмы, чытаць даклады. Павятовая акадэмія запланавана ў вёсцы Трасцянка. У пленуме прыняла ўдзел Надзя Даніловіч — кіраўнік арганізацыйнага аддзела ГП БГКТ.

■ 7 сакавіка на сходзе гуртка БГКТ у вёсцы Залукі ў Беластоцкім павеце (гурток налічвае 45 членаў) шмат увагі было прысвечана справам арганізавання народнага фэстыну. Назаўтра, у нядзелю, члены БГКТ і ЗСМВ грамадскім чынам працавалі пры парадкаванні пляцу пры сваім клубе.

■ У нядзелю 8 сакавіка ў Шымках і Рыбаках, а ў панядзелак у Меляшках у школах кінаперасоўкай ГП БГКТ былі паказаны два савецкія фільмы „Ніна" і „Дарагой цаной". У Зубрах дэманстраваўся фільм „Ніна" (вёскі гэтыя ў Беластоцкім павеце).

■ 8 красавіка гурток БГКТ у Рыбаках (старшыня Мікалай Хлябіч) абмяркоўваў арганізацыйныя справы, звязаныя з традыцыйным ужо народным фэстынам, які вырашылі праводзіць кожны год у першую нядзелю ліпеня. У гэты дзень усе члены аплацілі членскія складчыны.

■ Ад паловы лютага праводзіць рэгулярны 14-асабовы танцавальны калектыў у Белавежы, мастацкім кіраўніком якога з'яўляецца Янка Крупа.

■ Нядаўна адбыўся сход моладзі ў Сачкоўцах (Сакольскі павет) з удзелам Янкі Крупы — працаўніка ГП і Ірэны Місеюк — штатнага працаўніка сакольскага аддзела БГКТ. Прысутныя пастанавілі стварыць у сваёй вёсцы драматычны гурток.

■ Галоўным пунктам пленума праўлення гарадскога аддзела ў Беластоку (адбыўся 13.IV) быў даклад старшыні аддзела Мікалая Гайдука на тэму працы аддзела з актывам. Падсумаваны таксама былі дасягненні аддзела ў бягучай кадэнцыі. У дыскусіі выступілі Іван Стрышко, Уладзімір Навіцкі, Анна Амбражэй, Марыся Пракапюк, Анатоль Казмерук, Кастусь Масальскі, Уладзімір Паўлоўскі, Міхась Усціловіч, Міхась Хмялеўскі, Валя Філіпюк. Усе яны выказвалі свае думкі наконт лепшай працы аддзела. Старшыня ГП БГКТ Мікалай Самоцік станоўча ацаніў дзейнасць аддзела, расказаў аб асноўных напрамках працы ГП і задачах аддзелаў і пажадаў членам праўленняў яшчэ больш дасягненняў на ніве беларускай культуры ў горадзе Беластоку. У прынятай пастанове пленума гаворыцца аб патрэбе лепшай працы з членамі харавога калектыву, аб утварэнні танцавальнага гуртка і тэатральнага калектыву, аб павелічэнні колькасці чытачоў „Нівы" ў Беластоку, аб арганізаванні народнага фестыну, аб грамадскім чыне аддзела, аб утварэнні фатаграфічнага гуртка і г.д.

Пленум займаўся таксама арганізацыйнымі справамі. Вывёў ён з членаў прэзідыума і членаў праўлення Зосю Стаськевіч і Янку Кірызюка ў сувязі з іх выездам з Беластока. На іх месца ў склад прэзідыума выбраны Валя Цімашук (сакратар аддзела) і Валя Філіпюк. З членаў праўлення выведзены таксама Аляксандр Багаэвіч (па яго просьбе), а на яго месца выбраны Язэп Варонскі — студэнт III курса Вышэйшай інжынерскай школы. Вёў пленум намеснік старшыні аддзела Уладзімір Паўлоўскі.

■ 13 сакавіка старшыня ГП Мікалай Самоцік і кіраўнік культурна-асветнага аддзела ГП Валя Філіпюк падпісалі дагавор са студэнцкай радай Вышэйшай інжынерскай школы ў Беластоку і прадстаўніком дыскусійнага фільмовага клуба „Кляпсік" адносна таго, каб раз у тыдзень студэнты карысталіся з памяшкання ГП і арганізавалі дыскусіі над фільмамі.

■ Фінальным конкурсам „Што ведаеш аб СССР", спалучаным з мастацкай часткай, 14 красавіка Галоўнае праўленне БГКТ і яго орган „Ніва" закончылі святкаванне 50-ай гадавіны ўтварэння СССР.

■ У варшаўскім аддзеле БГКТ 13 красавіка адбылася дыскусія над зместам кніжкі Уладзіміра Паўлючука пад загалоўкам „Światopogląd jednostki w warunkach rozpadu tradycyjnej społeczności wiejskiej".

Вельмі шкада, што аўтар абяцаў, але не прыехаў на аўтарскую сустрэчу. (мх)



былі зроблены генеральныя парадкі ў цэлай вёсцы. Моладзь і старэйшыя многа папрацавалі грамадскім чынам пры будове злеўні малака, вясковай святліцы, дарог і пасадцы дрэў. — А не так даўно, — кажа солтыс Аляксей Гілевіч, — яшчэ ў 1957 годзе першыя мураванкі пабудавалі Аляксей Зялінка, Амяльян Казімерук, а зараз іх 90. Сёлета прыбудзе іх тры. Апрача дамоў, будзе пабудавана некалькі новых сельскагаспадарчых будынкаў.

Дружныя і добразычлівыя жывуць тут людзі. Яны заўсёды дапамогуць у бядзе. Калі згарэла ўся гаспадарка Антона Казімерука, сабралі яны 15 тыс. злотых грашыма, звезлі будаўнічыя матэрыялы, пабудавалі падмурак. Словам, памаглі стаць чалавеку на ногі. Моладзь дапамагла пры ўборцы збожжа і пры абмалотах.

Сухавольцам патрэбны водаправод. Вады тут недастаткова ў студнях. А без яе, як вядома, нялёгка пашырыць жывёлагадоўлю. Жыхары Сухавольцаў чакаюць таксама ўпарадкавання ўсіх спраў, звязаных з абменам сенажацяў і пасбішчаў. Чамусьці з гэтым не спяшаюцца толькі павятовыя ўлады.

У Сухавольцах жыве многа маладых гаспадароў, якія першымі пачалі спецыялізацыю ў свінагадоўлі і гадоўлі быдла. Добрыя вынікі ў сельскагаспадарчай прадукцыі атрымліваюць: Аляксандр Бажко, Пётр Сідарук, Яраслаў Герасімюк, Кастусь Шклярук, Пётр Пранявіцкі, Барыс Качко, Грыша Рэпко, Грыша Рута, Юрка Якубоўскі, Аляксей Багроўскі, Міхась Галёнка, Андрэй Рута, Ян Зялінка, Мікалай Якубоўскі, Аляксандр Нігерэвіч, Уладзімір Герасімюк, Павел Герасімюк, Грыша Шклярук, Юрка Нігерэвіч, Аляксандр Шклярук, Васіль Крук, Ян Дымітрук, Уладзімір Беляк, Васіль Зялінка і Уладзімір Бакун. Некаторыя з іх збіраюць каля 30 цэнтнераў збожжавых культур з гектара і па 280—300 цэнтнераў бульбы. Такія ўраджаі на зямельных угоддзях V і VI класаў сустракаюцца рэдка. Усе яны пабудавалі новыя аборы і завялі большую, чымсьці раней, колькасць хатняй жывёлы. З мэтай паляпшэння якасці быдла ўплацілі яны грошы на пародзістых цялят, якіх абавязаліся даставіць спецыялістычныя жывёлагадоўчыя прадпрыемствы.

У асенне-зімовы перыяд жыхары Сухавольцаў плятуць саламяныя каробкі і кашы. На іх яны някепска зарабляюць. Моладзь Сухавольцаў ведаюць у павеце з-за шматлікіх карысных ініцыятыў. Дапамагае яна пажылым аднавяскоўцам пры ўборцы збожжа. Будуе новыя дарогі, садзіць маладыя дрэўцы і г.д..

У мясцовым клубе заснавала яна беларускі тэатральны калектыў, а таксама вакальна-музычны калектыў, яны ўжо выступалі на павятовых аглядах у Гайнаўцы. Добра працуюць тут гурткі шахматыстаў, спартсменаў і фотааматараў.

Тэкст і фота **Я. Цялюшэцкага.**



Жыхары Сухавольцаў някепска падзарабляюць на саламяных кашах і каробках.

Пачатак на стар. 1

З МАЛОЧАК — ПРАЗ ЛЕНІНА — У БЕРЛІН

недзе ў палавіне красавіка 1945 года. Рака разлілася так шырока, што амаль не відаць было другога берагу. 15 красавіка мяне і харунжага Рудкоўскага з Гайнаўкі паслалі шукаць зручнага месца для пераправы нашай батарэі. Немцы вялі няспынны мінамётны абстрэл. Сярод узрываў стаўбы вады ўзнімаліся ў паветра. Схавацца не было дзе. Адзін толькі ратунак — у вадзе. Выкупаўся я тады на ўсё жыццё, бо што крок прыходзілася ныраць у студзёную бездань. Так мы дабраліся да аднаго астраўка. Там наткнуліся на атрад польскай разведкі. Сярод разведчыкаў не было ўжо аніводнага здаровага салдата, тых хто яшчэ даваў прызнакі жыцця, мы сцягнулі ў акопы і самі прабавалі ісці далей. Аднак варожы агонь быў такі моцны, што мы вымушаны былі вярнуцца назад.

Было гэта ў раёне мясцовасці Сякеркі, там, дзе цяпер узвышаецца манументальны помнік, праслаўляючы гістарычны подзвіг польскіх салдат. Фарсіраванне Одры адбылося на другі дзень 16 красавіка 1945 года.

— Немцы так заўзята білі па нашых вайсках, — успамінае Ян Кочук, — што я па сённяшні дзень не магу зразумець, як удалося нам перабрацца на другі бераг. Усе салдаты аднак смела ішлі ў гэтае пекла. Ды і часу не было, каб думаць пра ўласны лёс і пра тых, што заставаліся назаўсёды. Толькі даплылі да берагу, а тут пяхота крычыць: давай падтрымку! На нас ідуць нямецкія танкі! Як на злосць, дарогу нам перагарадзіў прыбярэжны вал, а нашы коні недзе загубіліся. Схапіліся мы за рыдлёўкі і як найхутчэй раскапалі верхавіну гэтага вала, а пасля дружна ўхапіліся за калёсы гармат. Паспелі. „Цігры" былі ўжо блізка. Дык мы з прамой наводкі... І раз за разам... Гак і гак... Варожыя танкі павярнулі назад. Наша пяхота пайшла ў наступленне, а мы за імі. 5 кіламетраў уласнымі рукамі цягнулі сваю гармату і ўсе боепрыпасы.

...Берлінская аперацыя прадаўжалася. 24 красавіка кальцо Савецкай Арміі і Польскага Войска вакол сталіцы III Рэйха было замкнута. У гэты дзень а першай гадзіне дня камандуючы І Беларускім фронтам маршал Жукаў пазваніў свайму падначаленаму, камандзіру Першай арміі Войска Польскага генералу Паплаўскаму:

— Што мяркуеце аб тым, каб Войска Польскае прыняло непасрэдны ўдзел у штурме Берліна?

— Гэта самая вялікая наша мара, — адказаў генерал.

— Якія сілы змаглі б вы зараз жа адкамандзіраваць дзеля гэтага?

— Адну ўзмоцненую дывізію.

— Якую? — пацікавіўся маршал.

— Першую Варшаўскую Дывізію пяхоты імя Т. Касцюшкі, — запрапанаваў генерал Паплаўскі.

— Добра, — згадзіўся маршал Жукаў і дадаў: — Гэта выдатная дывізія.

Такім чынам разам з гэтай дывізіяй у саставе яе першага палка апынуўся ля варот Берліна капрал-артылерыст Ян Кочук.

— У Берліне дык было так, што не дай бог... — расказвае ён. — Бралі мы яго проста па-пад зямлёю, прабіваючы праход з пограба ў пограб, бо кожны дом там быў пераўтвораны ў бункер, а на вуліцу дык зусім небяспечна было высунуць нос. Гітлераўцы залівалі нас безупынным агнём. На кожным кроку, за кожнай сцяной смерць сядзела ў засадзе. Здаралася і так, што заглянеш у пограб, там нібы цывільнае насельніцтва, адарвешся, выйдзеш, а з гэтага пограба б'юць панцырфаўстамі. І так дзень і ноч... без яды і сну... аж да капітуляцыі немцаў, да 2 мая...

Віктар Рудчык

Што? Дзе? Калі?

ПРАГРАМА МЕРАПРЫЕМСТВАЎ БГКТ НА НАСТУПНЫ ТЫДЗЕНЬ

Першамайскія акадэміі

Праграма мерапрыемстваў БГКТ на наступны тыдзень.

Васількова, 29.IV., 10 гадзін. Бельск, Плёскі, Сакі, Орля — 30.IV., 18 г. Рагачы, Мілейчыцы, Вулька Нурэцкая, Тымянка, Літвінавічы, Клюковічы, Вілянова — 30.IV., 19 г. Гарадок — 4.V., 19 г.

Даклады, сустрэчы вечарыны

Беласток — першамайская вечарына. 1.V. 18 г., шахматны і шашачны турнір — 5.V. 18 г.

Варшава — даклад А. Баршчэўскага, прысвечаны М. Танку — 4.V.

НА НІВЕ БГКТ

Энтузіясты беларускага слова

У мінулым годзе ў Саках на Бельшчыне быў заснаваны гурток БГКТ. У плане яго працы было прадугледжана стварэнне драматычнага калектыву. І вось моладзь пад кіраўніцтвам выпускніцы беларускага ліцэя ў Бельску Падляшскім Ані Лазавік узялася за падрыхтоўку дзвюх п'ес „Суд" і „Вывараджыла". І ўпершыню ў Саках у сваім клубе, пабудаваным грамадскім чынам, мясцовыя самадзейнікі захапілі аднавяскоўцаў беларускімі п'есамі. Калі ўбачылі людзі, як прыемна і культурна правялі яны вечар, сталі лічыцца са сваімі самадзейнікамі і адносіцца да іх з вялікай пашанай.

Упершыню ў вёсцы тады быў арганізаваны навагодні баль. Ды і танцавальныя вечары штораз былі лепшыя.

У гэтым годзе сакоўскія самадзейнікі падрыхтавалі зноў дзве п'есы — „10 гектараў" і „Люцынка-інжынерыха" і прынялі ўжо ўдзел у павятовым аглядзе беларускіх драматычных калектываў. Выступілі таксама на цэнтральным аглядзе ў памяшканні ГП і атрымалі ўзнагароду ад рэдакцыі „Нівы".

У сакоўскім гуртку БГКТ 14 членаў і ўсе яны маладыя, нежанатыя і незамужнія. Рэгулярна аплочваюць членскія складчыны, рэгулярна праводзяць сходы.

Хто ж яны, гэтыя маладыя?

Якуб Ясвіловіч у мінулым годзе закончыў эканамічны ліцэй у Бельску Падляшскім. Памагае працаваць бацькам на гаспадарцы.

Аня Шаховіч закончыла таксама сярэднюю школу і працуе цяпер бухгалтарам у міжгуртковай машынна-трактарнай базе (МБМ) у Пасынках. Прыйшоўшы з работы у МБМ-е, дапамагае бацькам на гаспадарцы.

Пеця Лапінскі з'яўляецца вучнем беларускага ліцэя. У маі будзе здаваць „матуру".

Яўген Паўлючук вучыцца ў рамеснай будаўнічай школе ў Бельску Падляшскім, а Тамара Паўлючук і Валя Купрыяновіч — у эканамічным ліцэі. Усе яны даязджаюць, усе яны кожную раніцу спяшаюцца на аўтобус, а ў 14^{30} або 16^{00} вяртаюцца дамоў.

Усе самадзейнікі шмат працуюць на гаспадарцы. Усім ім не больш 20-ці год. Не больш 20 год і Ані Лазавік — душы гуртка. Яна ў мінулым годзе закончыла беларускі ліцэй. Пасля дапамагала бацькам на гаспадарцы. Ад 15 красавіка з'яўляецца штатным працаўніком бельскага аддзела БГКТ.

М. Хмялеўскі
фота **А. Карпюка**



Пеця Лапінскі і Якуб Ясвіловіч у п'есе «10 гектараў».

Беларуская ЛІТАРАТУРА

Нашаніўская пара

ПУБЛІЦЫСТЫКА „НАШАЙ НІВЫ" — ЧАСТКА І

Дзевяцігадовая публіцыстычная спадчына „Нашай нівы" — гэта складаная і абшырная з'ява. Не будзем ёю займацца дэталёва. Звернем увагу толькі на тыя напрамкі публіцыстыкі „Нашай нівы", якія былі звязаны з нацыянальнай праблемай або з культурна-літаратурнымі пытаннямі.

Нацыянальная праблема заўсёды была ў цэнтры ўвагі публіцыстаў „Нашай нівы". „Наша ніва" абапіралася на сціплых дасягненнях беларускага нацыянальнага адраджэння XIX ст., выкарыстоўвала магчымасці, якія стварыла першая руская рэвалюцыя, імкнулася да разбуджэння нацыянальнай гордасці ў беларусаў. Нашаніўцы былі перакананы, што эвалюцыйны шлях культурных і сацыяльных пераўтварэнняў прывядзе Беларусь да волі і шчасця.

„Наша ніва" лічыла, што беларускі народ ёсць адзін, адсюль і дэкларацыі аб служэнні ўсяму народу. Тыднёвік прынамсі ў сваіх заявах хацеў быць органам надкласавым. У практыцы быў газетай тыпова сялянскай. Ужо ў першым нумары тыднёвіка ў праграмным артыкуле гаварылася: „Мы будзем служыць усяму беларускаму скрыўджанаму народу, пастараемся быць люстрам жыцця, каб ад нас як ад люстра, свет падаў у цёмнасць. Мы будзем старацца, каб усе беларусы, што не ведаюць, хто яны ёсць, зразумелі, што яны беларусы і людзі, каб пазналі свае правы і памаглі нам у новай рабоце". („Наша ніва" 1906 г. № 1).

Адну з галоўных перашкод у адраджэнні аб'яднанай беларускай нацыі бачылі нашаніўцы ў разбіцці беларусаў на праваслаўных і католікаў. З гэтай прычыны стараліся яны ў аднолькавай ступені кантактавацца з католікамі і праваслаўнымі. Таму ад 1906 да 1912 года „Наша ніва" выходзіла ў двух версіях. Для праваслаўных друкавалася яна кірыліцай, для католікаў — лацінкай. У 1912 годзе, з прычыны эканамічных цяжкасцей „Наша ніва" пачала друкавацца толькі кірыліцай.

Вынікі дзейнасці „Нашай нівы" ў галіне нацыянальнага адраджэння Беларусі былі настолькі істотнымі, што звярнулі на іх увагу многія тагачасныя даследчыкі. Варта тут прывесці выказванне польскага даследчыка Вагнеровіча, які ў 1912 годзе пісаў:

„Przeglądając szereg roczników „Naszej Niwy" możemy dokładnie zdać sobie sprawę, jak praca nad uświadomieniem Białorusi zakreśla coraz to szersze kręgi, co każdy rok niesie i na czym można już oprzeć stwierdzenie, że odradzający się naród mimo przeszkody roznieca swe ognisko samodzielnego poczucia etnicznego i kultury narodowej".

Нацыянальную праблематыку, выступаючую ў публіцыстыцы „Нашай нівы", можна ўмоўна падзяліць на наступныя тэмы:

тэма адзінства беларусаў-католікаў і беларусаў-праваслаўных;

тэма нацыяналізму, патрыятызму, шавінізму і інтэрнацыяналізму;

тэма адносін суседніх народаў да Беларусі і адносін беларусаў да іншых народаў;

тэма мінулага, сучаснага і будучага Беларусі;

тэма нацыянальнай культуры, літаратуры, мастацтва і тэатру;

тэма беларускай мовы і беларускай асветы;

тэма ролі нацыянальнай інтэлігенцыі ў працэсе адраджэння нацыянальнай свядомасці;

тэма дзейнасці беларускіх арганізацый, аб'яднанняў, таварыстваў, хаўрусаў.

З вышэй сказанага відаць, што дыяпазон нацыянальнай праблематыкі ў „Нашай ніве" быў вельмі шырокі.

Зразумела, што мы не можам тут нават павярхнасна ахарактарызаваць соцэнь артыкулаў, прысвечаных нацыянальнай праблеме. Хочам аднак сказаць, што мелі яны і па сваім змесце, і па сваёй форме вельмі розную вартасць. Некаторыя з аўтараў абмяжоўваліся эмацыянальнымі дэкларацыямі. Такіх публікацый было аднак параўнаўча мала. Другія абапіралі свае тэарэтычныя вывады на гістарычных фактах. Трэція для сваіх нацыянальных канцэпцый шукалі аргументаў у тагачаснай беларускай рэчаіснасці. Так ці інакш, варта пазнаёміцца з галоўнымі кірункамі нашаніўскай публіцыстыкі, прысвечанай нацыянальнаму пытанню.

ЛЮДЗІ З ЛЕСУ

Штогод у красавіку наша грамадскасць адзначае Дні лесу, і таму менавіта Ваяводскае праўленне Лігі аховы прыроды вырашыла арганізаваць 11 красавіка гэтага года ў кавярні Дома прафсаюзаў надзвычай цікавую сустрэчу з людзьмі лесу пад лозунгам „Будзе лес!“ Мерапрыемства было цікавае па ідэі і прадумана да канца. Былі паказаны і цікавыя фільмы, і каляровыя дыяфільмы аб багатым жыцці Белавежскай пушчы, аб яе флоры і фаўне, каментаваныя др Чэславам Аколавым з Белавежскага прыродазнаўчага музея, і невялікі даклад інжынера Станіслава Пліта, інспектара Ваяводскага праўлення дзяржаўных лясоў, расказаўшага аб лясной гаспадарцы і карысці, якую прыносяць нам лясы, аб патрэбе іх аховы.

Найбольш цікавай аднак часткай вечару былі гутаркі з людзьмі, якія ўсё жыццё правялі ў лесе, якія наогул не ўяўляюць жыцця без лесу і кахаюць яго, як нешта самае блізкае і дарагое. Яны прыехалі ў Беласток, каб падзяліцца здарэннямі са свайго жыцця, сваімі перажываннямі і пачуццямі, яны прывезлі з сабой атмасферу лесу.

Бронка (Браніслава Баршча, гаёвага з Навагродскага надлясніцтва з Ломжынскага павету) ведаюць на Курпях ад малога да старога. Тут ён нарадзіўся і вырас, сюды прывандраваў калісьці яго прадзед, хаваючыся ад праследаванняў царскай паліцыі за ўдзел у Лістападаўскім паўстанні. Пан Бронэк жыве ў вёсцы Ляскі, што ў дванаццаці кіламетрах ад Навагрода. Праца яго нялёгкая — лес у практыцы прыходзіцца ахоўваць 24 гадзіны ў суткі. Але ён ужо ведае, калі трэба сачыць за лесам больш пільна (у задымку, у віхуру зьвяршаюцца найчасцей лясныя злачынствы), а калі можна і адпачыць, і тады пан Бронэк аддаецца поўнасцю свайму другому замілаванню — разьбе па дрэву. Найбольш выразае з дрэва птушак, малюе іх пасля каляровымі фарбамі, прымацоўвае дроцікам да памаляваных зялёным колерам галінак і ўпрыгожвае імі хату.

Сяргею Вашкевічу з Белавежы ўжо 75 гадоў, але на вока ніхто б яму не даў больш 60-ці. Жыццё ён пражыў у Белавежскай пушчы, тут працаваў лоўчым і вёў лавецкую гаспадарку. У абавязкі яго ўваходзіла і ахова звярыны, і гадоўля, і адстрэлы, і кантакты з паляўнічымі. „Пушчу ведаю нават уначы“, — упэўнена кажа ён. І хаця цяпер Сяргей Вашкевіч ужо пенсіянер, сувязей з пушчай ён не траціць. А яшчэ зусім нядаўна вучыў у Лясным тэхнікуме ў Белавежы, як даваць лясныя сігналы. На сустрэчу з беластачанамі ён прыехаў са сваім сігнальным ражком, якім штораз выігрываў сігналы, здзіўляючы большую частку публікі, для якой яны сталі ўжо абсалютным анахранізмам: сігнал на смерць зубра, на смерць лося, выезду на паляванне, развітання з лесам. — Цяпер, — кажа ён з сумам, — ніхто ўжо амаль на сігналах не знаецца — яму трубіш, каб вырушыў альбо куды мае ісці, бо на правым крыле лепшы тэрэн, а ён цябе не разумее...


Ліга аховы прыроды запрасіла на сустрэчу з беластачанамі людзей з двух рэгіёнаў Беласточчыны. Розная іх гаворка, розныя і іх пушчы — у Белавежы шмат вялікіх звяроў, больш буйная і багатая расліннасць, у Курпёўскай жа пушчы найбольшы звер — гэта воўк, зрэдку сустракаецца лось, ды і флора бяднейшая. Яднае аднак гэтых людзей адно: вялікая і шчырая любоў да лесу, да прыроды, да ўсяго таго, што створана натурай і сярод чаго дадзена жыць чалавеку.

58-гадовы пан Бронэк кажа нам на развітанне, што збіраецца ў санаторый, і паясняе: „Рэўматызм мучыць, хаця калісьці „казака“ танцаваў, як на пружынах. Хочуць выслаць мяне на рэнту... А вось гавару так, няхай лепш вылечаць — а без лесу я не магу...“

Ада Чэчуга

ФАЛЬКЛОР

ВЯСЕЛЬНАЯ



Не ду-бок пры ніў-цы ў га-і, не ў лу-зе лі-лей — ка —



Ма-ла-ды тут за-ся-да-е з сва-ёй даб-ра-дзей-кай.

Не дубок пры ніўцы ў гаі, не ў лузе лілейка —
Малады тут засядае з сваёй дабрадзейкай.
Хто ўцеху ўсю іх пойме, што ў душу ім ліецца.
Хто спазнае, хто перойме думкі наважэнцаў?
Зышла радасць на абое, бачыць сэрца сэрца.
Мілым шчасце залатое сцелецца каберцам.
З госцяў кожны віншаванне гладкім слоўцам кіне.
Мае простае жаданне такжа хай не згіне.
Жычу моцы, як нікому, жычу я ахвоча:
Маладой і маладому — усё, што толькі хочуць.
Згоду ў хатцы, спор у хатцы, гонар між людзямі
І ў які год дачакацца забавы з кумамі,
І ў які год дачакацца забавы з кумамі!

Ад Ніны Мушынскай, 1910 года нараджэння, — вядомага дзеяча на ніве беларускай народнай культуры ў Польшчы, якая жыве ў мястэчку Гарадок, Беластоцкага павету, запісаў 24 студзеня 1973 г. Мікалай Гайдук. Нотны запіс з магнетафоннай стужкі зрабіў Эдуард Гойлік.

ЛЮДЗІ ДОБРАЙ РАБОТЫ



Міхал Тарасюк — брыгадзір электрычных прылад выконвае працу пры рамонце цеплавозаў.



Казімір Чэкуць, Васіль Крупіч і Фелікс Стэрнічук — работнікі паравазоўні ў Чаромсе. фота **А. Карпюка**

ЛІСТ З ДУБЯЖЫНА

УСЁ ПРА НАШУ ВЁСКУ

Хачу я сказаць вам, што ў нашай вёсцы здараюцца розныя прыгоды: і добрыя і трохі нядобрых. Пісаць буду не толькі ад сябе, але ад усіх нашых чытачоў „Нівы“, якія часта заходзяць у хату і гавораць аб усім. Таксама ўвечары сустракаемся на рэпетыцыях нашага хору. Старыя часта бядуюць, а маладыя не ставяць сур'ёзных спраў і замнога жартуюць. Гэтак яно бывае ў жыцці.

А ўсё ж хачу сказаць, што ў нашай вёсцы Дубяжына іншыя вёскі могуць знайсці добры прыклад. У нас усе работы, якія толькі людзі могуць зрабіць, зроблена.

Ёсць у нас млын, мелецца там збожжа на сруту. Прыязджаюць сюды сяляне таксама з іншых вёсак. Ёсць у вёсцы два кавалі. Выконваюць яны паслугі для сваіх сялян і з другіх вёсак.

Людзі ў нашай вёсцы любяць лад і парадак, чысціню на кожным панадворку. Мы прыступілі да конкурсу „Беластоцкая вёска — гаспадарная і культурная“. Людзі кажуць: „Раз узяліся — стрымаем слова. Пастараемся мо нават якую ўзнагароду здабыць для свайго Дубяжына“. Абавязаліся ў нас угнаенні выкупіць у ста працэнтах, а купілі і больш. Кантрактацыя жыта пайшла ў вёсцы таксама на сто працэнтаў.

Трэба праўду сказаць — наша вёска не спіць, а хоча даць дзяржаве многа збожжа, а таксама і мяса для працоўных у гарадах. Яны ж нам выраблюць сельскагаспадарчыя машыны і іншыя патрэбныя ў гаспадарцы тавары.

Хачу яшчэ сказаць, што ў нашай вёсцы распачаўся сельскагаспадарчы курс II ступені, які вядзе Крыстына Себятынская — наш гмінны інструктар з вышэйшай адукацыяй. Удзельнікаў не бракуе, ахвотна слухаюць пра гаспадаранне на зямлі. Усе цяпер хочуць навучыцца выдабываць з зямлі больш плёнаў і лепшых.

Знайшліся ў нас маладыя гаспадары, якія прабуюць гадаваць па 30 штук свіней. Гэта найлепшыя гаспадары ў вёсцы. Вось для прыкладу Пятро Аверчук, сын Андрэя. Ён цяпер гадуе 20 штук. Кожны месяц здае па 2—3 штукі, а хоча яшчэ больш. Працуе на гаспадарцы з жонкай. На ўтрыманні ў яго стары бацька і маці. Але як пільна ён узяўся за сваю гаспадарку! Адбудаваўся — на ўсю вёску Дубяжына! Хачу, каб усе чытачы нашай „Нівы“ бралі прыклад з такога чалавека, як Пятро Аверчук, сын Андрэя з Дубяжына.

Дадаць хачу яшчэ ўвагу, якая мне прышла ў галаву пасля прачытання ў „Ніве“ артыкула „А ў Кошках ціха“. Чаму ж ціха? Цэпэлія ж зрабіла ім святліцу, аддала вялікія грошы на культуру для іхняй вёскі, а ў вёсцы цяпер пра гэта забыліся. Грошы пайшлі, можна сказаць, дарма і ніхто не зойдзе ў тую святліцу. Не паспяваюць там нашых песень, не паставяць п'есы. А ўсё з-за той саломы, у якую паверылі сяляне Кошак. Мо і ў нас так было б, але ў нас такі народ, што хіба толькі тады не рушыўся б, як хто прывязваў бы да гэтай саломы пастронкам. То ж у доўгія вечары трэба чалавеку пайсці да суседа, сабрацца калектывам, паспяваць разам, пайсці на сельскагаспадарчы курс і гэтак далей.

Вось толькі ў нас святліцы яшчэ не закончылі. Абяцалі кіраўнікі Цэпэліі з Беластока калісь памагчы і нам, але ўжо і забылі бадай. А Дубяжына, як і Кошкі — усе тут з'яўляюцца членамі спулдзельні Цэпэлія, усе плацяць складчыны па 2500 зл. Ад нас спулдзельня Цэпэлія вымагае. Вось калі быў забалочаны пляц скупкі ў Бельску, сказалі: няхай вёска Дубяжына прывязе жвіру. Мы вазілі і не адмаўляліся. Але хочам бачыць усіх роўнымі. Калі прымаюць саламяныя вырабы, то аднолькава ад усіх. А ў бельскай скупцы саламяных вырабаў аднаму прымуць на 100 тысяч злотых, а другому на 100 злотых. Думаю, што трэба мець пачуццё справядлівасці для ўсіх. Трэба зрабіць так, каб і наша вёска Дубяжына магла прывезці кожны месяц свае саламяныя вырабы на пункт скупкі ў Бельску, а не так, як загадвае грамадзянін Сахарчук, што для Дубяжына няма скупкі па тры і чатыры месяцы.

Цэпэлія ў Беластоку, зацікаўся гэтай справай.

М. Р. Дубяжына

БЕЛАРУСКІЯ КНІГІ

У кнігарні імпартных выданняў у Беластоку, вул. Кілінскага 10, можна набыць наступныя кнігі на беларускай мове:

Купала Янка, Алеся; Хлопчык і лётчык, 1970, цана 1 зл.

Папулярныя гэтыя вершы аздобілі густоўнымі каляровымі ілюстрацыямі вядомыя сучасныя беларускія мастакі Ул. і М. Басалыгі.

Грахоўскі Сяргей, Агеньчык у акне, 1972, стар 64, цана 2 зл. 40 гр.

Зборнік займальных апавяданняў сучаснага беларускага пісьменніка. Выданне ўзбагацілі ілюстрацыямі М. Бельскі. Апавяданні, змешчаныя ў зборніку, кароценькія і вельмі зручныя для выкарыстання на ўроках беларускай мовы і на пазакласных занятках. Яны адрасаваны для дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

Навуменка Іван, Падарожжа ў юнацтва, 1972, стар. 434, цана 9 зл. 60 гр.

Зборнік выбраных твораў сучаснага беларускага празаіка, літаратуразнаўцы і прафесара Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У выданні знаходзім апавяданні, навелы і аповесці („У бары на світанні“, „Мой сябар Пятрусь“, „Снежань“), якія прысвечаны юнацкім марам, першаму нясмеламу каханню і цяжкім выпрабаванням Айчыннай вайны, што выпалі на долю сённяшняму старэйшаму пакаленню.


Савіцкі Алесь, „След пракладае першы“, 1971, стар. 272, цана 6 зл. 70 гр.

Дакументальная аповесць пяра сучаснага беларускага празаіка сярэдняга пакалення, былога партызана і салдата, удзельніка баёў за вызваленне Варшавы і Гдыні. Аповесць прысвечана жыццю, дзейнасці і імкненням сучаснага працоўнага чалавека ў Савіцкай Беларусі.

Кнігарня імпартных выданняў у Беластоку ахвотна высылае кнігі за паштовым залічэннем з далучэннем рахунку, калі гэтага патрабуе пакупнік. Запатрабаванні кіруйце на адрасу:

„Dom Książki“, Białystok, ul. Kilińskiego 10.

(мг)



Аўтапоезд грузапад'ёмнасцю 120 тон.

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ З МІНСКА

Беларускія гіганты — аўтасамазвалы

Непадалёку ад аўтастрады Мінск—Масква ўзвышаюцца, створаныя са шкла і бетону, прамысловыя карпусы Беларускага аўтамабільнага завода. Тут, у горадзе Жодзіна, нараджаюцца магутныя БелАЗы, якія заваявалі сабе славу не толькі ў нас, але і ў многіх краінах свету.

Гэта адзінае ў Савецкім Саюзе прадпрыемства па выпуску аўтамабіляў-самазвалаў. Яны з'яўляюцца высокавытворчым і эканамічным відам транспарту, які шырока прымяняецца на будаўніцтве гідраэлектрастанцый, пры дабычы карысных выкапняў адкрытым спосабам, пры пракладцы каналаў і праходцы тунеляў.

Беларускі аўтамабільны завод створаны на базе завода „Дормаш" у 1958 годзе. У лістападзе гэтага ж года калектыў прадпрыемства выпусціў першую 25-тонную аўтамашыну, а з 2 лютага 1959 года пачаўся серыйны выпуск аўтасамазвалаў.

Адначасова з гэтым малады калектыў канструктараў прыступіў да распрацоўкі новай мадэлі аўтамабіля, які па сваіх тэхніка-эксплуатацыйных якасцях быў бы на ўзроўні лепшых сусветных узораў. Пошукі былі закончаны поспехам. Ужо ў верасні 1961 года быў выраблены першы вопытны ўзор аўтамабіля-самазвала „БелАЗ-540" грузапад'ёмнасцю 27 тон. Ён аказаўся настолькі арыгінальным і патрэбным, што Дзяржаўная камісія рэкамендавала запуск яго ў серыйную вытворчасць да заканчэння выпрабаванняў, а спецыялісты Лейпцыгскай ярмаркі ў 1965 годзе аднагалосна прысудзілі яму Залатую медаль.

Высокія эксплуатацыйныя якасці зрабілі 27-тонны аўтасамазвал базавай мадэллю для цэлага сямейства яшчэ больш магутных машын з шырокай уніфікацыяй вузлоў і дэталяў. Праз тры з паловай гады на яго базе былі распрацаваны канструкцыі 40-тоннага аўтасамазвала.

У 1969 годзе завод падрыхтаваў узор новага аўтасамазвала грузапад'ёмнасцю 75 тон, які праходзіць выпрабаванні ў кар'еры Крываарожскага басейна.


Хуткае развіццё горнадабываючай прамысловасці, неабходнасць больш рацыянальнага выкарыстання кар'ернай тэхнікі ў сучасны момант патрабуюць ад канструктараў стварэння больш магутных машын. Калектывам завода ўжо пабудаваны аўтапоезд грузапад'ёмнасцю 120 тон, а ў канструктарскім бюро працуюць над стварэннем новых мадэляў машын грузапад'ёмнасцю 200—220 тон.

За стварэнне сямейства вялікагрузных аўтамабіляў групе інжынерна-тэхнічных работнікаў Беларускага аўтамабільнага завода прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР, а многія рабочыя ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза.

Разам з будаўніцтвам завода рос і гарадскі пасёлак. Цяпер у распараджэнні аўтазаводцаў Палац культуры, стадыён, камбінат бытавога абслугоўвання, кінатэатры, бальніцы, дзіцячыя сады і яслі, філіял Беларускага палітэхнічнага інстытута і іншыя культурна-бытавыя ўстановы.

Былая вёска Жодзіна ператварылася ў сучасны індустрыяльны горад, вырабляючы аўтамабілі-гіганты, якія працуюць на буйнейшых будоўлях Савецкага Саюза і многіх зарубежных краін.

В. Казлоў, фота аўтара.



Куток практычных ведаў



ЯК ЧЫСЦІЦЬ АБУТАК

Мой знаёмы наракаў: „У маёй жонкі ёсць сем пар абутку". „Добра, — кажу, — жанчыне абутку ніколі незамнога". „Але ж, пані, — адказвае ён, — можа быць і пяцьдзесят. Але ў маёй жонкі цікавыя звычаі. У панядзелак абувае адны туфлі, у аўторак — другія, у сераду — наступныя і гэтак далей, аж да нядзелі. Кожныя туфлі, у пыле ці ў гразі, кідае ў кут". „Што ж яна робіць у наступны панядзелак, калі ўсе туфлі брудныя?" — пытаюся я. „А ў панядзелак выцягвае іх з кучы і пачынае ізноў спачатку..."

На жаль, аб гэткіх гаспадынях даводзіцца чуць не раз. І як жа часта мы забываемся, што аб прыгожым і элегантным выглядзе чалавека сведчыць не толькі добра скроены касцюм ці сукенка, прыгожая кашуля ці капялюш на галаве, але і адпаведна падабраны, пры тым абсалютна чысты абутак.


А б у т а к з г л а д к а й с к у р ы трэба спачатку ачысціць шчоткай ад пылу, а калі ёсць гразь, змыць яе вадой, пакуль яна яшчэ не засохла. Абутак надзець на правідлы, або напхаць у яго паперы і пастай, падобнай колерам да абутку, нацерці яго. Праз мінут пятнаццаць абутак выглянсаваць. Белы, альбо наогул светлы абутак трэба памыць малаком, высушыць і выглянсаваць. Калі белы абутак вельмі забруджаны, варта чысціць яго ватай, змочанай у крэме „Nivea".

А б у т а к с а ш т у ч н а й с к у р ы мыем летняй вадой з мылам, палошчам чыстай вадой і выціраем сухой анучкай.

Г у м о в ы а б у т а к вельмі практычны, але, як вядома, не прапускае паветра. Каб ногі не пацелі, трэба ў гумовыя боты апранаць ваўняныя шкарпэткі, якія неабходна часта праць. Гумовы абутак мыем вадой з мылам. Белы альбо вельмі светлы абутак трэба памыць шчоткай і мыльцам „Іхі", дакладна спаласнуць і выцерці насуха.

З а м ш а в ы а б у т а к чысцім заўсёды ўсухую. Найлепш чысціць яго спецыяльнай драцяной шчотачкай. Месцы асабліва заношаныя, якія сталі ўжо бліскучымі, трэба чысціць гумовай шчотачкай, а калі яе няма, дык можна і звычайнай гумкай для алоўкаў. Каб адсвежыць замшавы абутак, можна купіць таксама спецыяльныя растворы, якія трэба прымяняць паводле рэцэпту на ўпакоўцы.

Гаспадыня





Мартынаў паволі падняўся. Аўтамат, які ён трымаў у руцэ, глядзеў дулам у зямлю. „Цяпер запытаюць, чаму ты не застрэліў фашыстаў, — гаварыў ён сабе, — а ты скажаш, што зрабіць гэтага не мог. А чаму? Але навошта мне іх забіваць, іх і так схопяць".

Старшы лейтэнант Сяргей Максімавіч Мартынаў пачаў асцярожна прабірацца паміж дрэў, вобмацкам знаходзячы дарогу ў цемры.

Франке аж дыхаць перастаў. Ён не бачыў, куды скіравана зброя Мартынава, таму ўважліва прыслухоўваўся да кожнага гуку. Каб выпадкова метал зазвінеў аб метал, Франке адразу ж націснуў бы на спуск.

Франке крыху счакаў і, калі пачуў, як недзе далёка трэснула галінка, расштурхаў Вайтхазе і Будэра.

— Мартынаў знік, — шэптам сказаў ён. — Я толькі што прачнуўся, гляджу — Мартынава няма.

— Значыць, наважыў нас выдаць, — прамовіў Вайтхазе.

— Навошта было расказваць яму пра групу Грэльхамера, — з дакорам сказаў Будэр.

— Цяпер і я разумны, — адказаў Вайтхазе.

Памаўчалі, прыслухоўваючыся да цішыні начнога лесу. Лес маўчаў.

— Яго і след прастыў, — прагаварыў, нарэшце, Франке.

— А ледзь развіднее, ён уваліцца сюды з рускімі. Неабходна зараз жа знімацца з месца, — прыняў рашэнне Вайтхазе.

Будэр стаяў, нізка апусціўшы галаву і звесіўшы рукі, быццам яго моцна ўдарылі кулаком у грудзі. Цяжка было прымірыцца з думкай, што зноў прыйдзецца немаведама куды ісці! І што так і не ўдасца паспаць хоць адну ноч.

— Хто цяпер панясе батарэі? — запытаў ён.

— Давядзецца мне, — сказаў Франке.

— У Сталінградзе, — шэптам расказваў Будэр, — я так знямог, што без чужой дапамогі не мог нават падняцца па трапу ў самалёт. Не таму, што ў мяне было прастрэлена плячо, а таму, што не меў ні хвіліны адпачынку, згаладаўся, суткамі не спаў. Здаецца, я больш тыдня не вытрымаю. А вы?

— Трэба ўзяць сябе ў рукі, — супакойваючы, сказаў Вайтхазе. — А цяпер прыйдзецца адыйсці адсюль, прынамсі на восем—дзесяць кіламетраў.

Будэр на́вочыў на сябе рацыю. Франке ўзяў батарэі і сумку з патронамі. Вайтхазе панёс рэшткі харчовых прадуктаў. Неўзабаве выйшлі на дарогу, абапал якой стаялі бярозы, — іх белая кара добра паказвала ў цемры шлях. Крочылі не спяшаючыся. Маўчалі. Праз гадзіну вачам іх адкрылася бязлесная раўніна. Над невысокімі ўзгоркамі мігцелі зоркі. У лісці дрэў, што раслі на ўскраі лесу, шамацеў вецер, падарожнікі спыніліся. Іх прабіраў холад.

— Што за краіна такая! — усклікнуў Будэр.

— Хіба вы мала прабылі ў Расіі? — запытаў Вайтхазе.

— З самага пачатку. Калі зноў апынуся дома, ніколі ў лес не пайду. Хлопчыкам я вельмі любіў лес, пазней таксама. Але цяпер, колькі жыць буду, ніколі ў лес і нагой не ступлю — я гэта цвёрда вырашыў.

Па раўніне ісці яны не адважыліся — не ведалі, як далёка яна прасціраецца, і баяліся, каб іх не заспеў на ёй дзень. Таму пайшлі назад, у цемру лесу, і забрылі ў самы гушчар. Дзень прабавілі там, а ноччу працягвалі шлях на поўнач. Калі назаўтра зноў пачало брацца на ноч, яны раптам выйшлі на бераг нейкага возера. Паміж пяшчаных берагоў, якія месцамі параслі крапівой, блішчэла празрыстая вада. Дзе-ніздзе віда́ць былі кучкі трусіных норак. Аблюбавалі сабе пагорак, ззаду якога было возера, а з двух другіх зарослая чаротам багна — нешта накшталт паўвыспы, да якой вяла вузенькая палоска зямлі. Глеба была сухая з тоўстым дываном верасу, а зверху над ім навіслі густыя шаты сосен. Агледзеліся па баках і зразумелі, што лепшага месца для прывалу знайсці было б цяжка.

— Гляньце, як тут прыгожа, — сказаў Будэру Вайтхазе. — Зірніце на возера — райскі куток. — Быццам дзе-небудзь у Брандэнбургу, толькі няма дачнікаў і скрогату патэфонаў.

— Лес... — адказаў Будэр. — Я ненавіджу лес.

Назаўтра днём хмары на небе рассеяліся, і сонца расквеціла возера стракатымі ўзорамі. Усе трое памылі свае мундзіры і ніжнюю бялізну. Сядзелі на кукішках на пясчаных схілах берага, сочачы за вясёлай валтузнёй трусоў каля норак.

— Эх, каб можна было тут трохі пабыць! — уздыхнуў Будэр.

— Што ж, такая магчымасць ёсць, — азваўся Вайтхазе. — Скажыце, Будэр, як у вас з шыфрам? Я ні шыша не разумею ў радыё і ва ўсёй гэтай справе, але ўвесь час думаю: а што, калі рускія перахопяць нашы перадачы і раскрыюць шыфр — яны ж могуць самі перадаваць, а нашы падумаюць, што гэта вы перадаеце. Саветы ж могуць завабіць самалёты ў іншае месца і атрымліваць наш груз замест нас.

— Гэта ім не ўдасца, — адказаў Будэр. — Ці бачыце, перад кожнай радыёграмай і ў канцы яе я перадаю некалькі кодавых літар, дзве ці тры, па спецыяльнай сістэме. Ад аднаго толькі шыфра рускім мала карысці.

— А што за сістэма такая?

— Ваенная тайна.

— А што здарыцца, калі рускія, перадаўшы шыфроўку, перабляітаюць код?

— А нічога. Нашы адразу зразумеюць, што радыёграма фальшывая.

Надвячоркам Вайтхазе сказаў, што зноў адпраўляецца да падпалкоўніка Грэльхамера па чарговую дэпешу.

Прайшоўшы крыху на ўсход, ён збочыў на поўдзень і апоўначы дабраўся

ТРЫБУНА чытачоў

Тапчыкалаўскі букет

Гурток вясковых гаспадынь у Тапчыкалах уключыўся ў конкурс „Букет гародніны і кветак“. У лютым, у дні сельскагаспадарчай кніжкі, гаспадыні чыталі адпаведную літаратуру, а вясною ў іх было ўжо падрыхтавана насенне мала вядомых на вёсцы кветак і гародніны. Справа гонару тапчыкалаўскіх жанчын — увесці ў свае агародчыкі малавядомую карысную гародніну. І кветкі яны намераны садзіць такія, каб квітнелі ад ранняй вясны да позняй восені. У кожным гародчыку ўжо пасаджаны карчы ружаў. Гаспадыні маюць таксама інспектавыя вокны.

Хвалім руплівых гаспадынь з Тапчыкалаў.

Наглядальнік



БЕЛАВЕЖА ВЯСНОЙ

У Белавежскай пушчы жыва
Растаяў магутны снег
І ўсе птушкі зноў шчаслівa
Прыляцелі ў гэты лес.

Белавежа, Белавежа,
Прыгажунскі, густы бор.
У ім стаіць славута вежа,
А над ёю птушак хор.

Прыляцелі з краёў цёплых
Праз Еўропу напралом,
Каб закласці ў пушчы нашай
Гаманлівы родны дом.

Пётр Бахенек,
вучань І класа беларускага ліцэя ў Бельску.

ВЯСНА

Стала ўжо цяплей,
Бо прыгрэла сонца.
Пяе салавей
На дрэве бясконца.

У чырвоных ботах
Захаваўшы лапкі,
Бусел на балотах
Спрытна ловіць жабкі.

Васіль Асеннік,
Бельскі беларускі ліцэй.

ВЯСНА

Калі цёплы настаў ранак,
Заспяваў жаваранак.
Ён цешыцца вясной,
Прыгожай такой.

На поле вышлі трактары,
Працуюць цэлы дзень.
Увіхаюцца гаспадары,
Каб хлеба хапіла ўсім.

Міраслаў Бусловіч, Аўгустова.

да лесу, з якога іх надоечы вывела абсаджаная бярозамі дарога. Паблукаўшы крыху па лесе, ён знайшоў, нарэшце, дарогу і па ёй пакрочыў назад у глыб лесу. Ён ішоў крыху хутчэй, чым тады, калі яны ішлі разам з Будэрам і Франке, бо цяпер рукзак яго быў амаль пусты. Каля трох гадзін ночы ён сеў адпачыць і падсілкаваўся. Пасля рушыў далей.

Даўно ўжо развіднела, калі наперадзе паказалася вёска. Вайтхазе вельмі стаміўся, больш, чым за час сваіх неаднаразовых начных пераходаў, таму што на гэты раз шлях яго быў больш далёкі, чым раней. Ён вылічыў, што прайшоў каля трыццаці кіламетраў.

Выйшаўшы з лесу, Вайтхазе сцішыў крок і пачаў прыглядацца да хат, шукаючы вачыма вартавога. Аднак, акрамя нейкай жанчыны, што мыла бялізну, нікога не ўбачыў. Ён прывітальна кіўнуў ёй галавой, і жанчына адказала яму тым жа. Ён не памятаў, ці бачыў яе раней, але жанчына, відаць, ведала яго, бо нічым не паказала, што здзівілася, убачыўшы яго.

(Працяг будзе)

З ДУМКАЙ АБ ДАЖЫНКАХ

Яшчэ да дажынак у Беластоку больш як чатыры месяцы, а ўжо ў Шудзялаўскай гміне думаюць пра іх. Правяла пасяджэнне камісія ладу і грамадскага парадку, якая вырашыла ўпарадкаваць усе двары, вуліцы і дарогі. Падобнае рашэнне прыняла і гмінная рада народовая. Апрача гэтага, вырашана ўпарадкаваць прыдарожныя дрэвы і ўказальнікі, а таксама пабяліць хлявы. А. С.

УЖО Ў МУЗЕІ

Сціральныя машыны выціскаюць з нашых вёсак міжваенную хатнюю тэхніку ў музеі. Гэтыя экспанаты мы фатаграфавалі ў Этнаграфічным музеі ў Цеханоўцы. Фота **А. Карпюка**



Сардэчныя ТАЙНЫ

Дарагое «Сэрцайка!»

Жыву я на вёсцы. Працую настаўніцай у школе. Ужо мінула год часу, як я сябрую з хлопцам, з якім пазнаёмілася на забаве ў нашай вёсцы. Янэк працуе ў горадзе і мы спатыкаемся толькі раз у месяц. Ён мне вельмі падабаецца. Часта гаварыў, што мяне кахае, што хутка пажэнімся, што яму вельмі сумна без мяне. Разам мы адчувалі сябе вельмі добра, не было ніякіх спораў, непаразуменняў. Але вось на апошнім спатканні мы пасварыліся. Аднак, нягледзячы на гэта, Янэк гаварыў, што напіша мне, што прыедзе да маіх бацькоў, каб абмеркаваць справы вяселля. Ужо мінуў месяц часу, а ад яго няма ніякіх вестак. Розныя думкі кружацца ў маёй галаве. Я баюся, што, можа, усё ўжо скончылася. Парай, „Сэрцайка“, што рабіць? Мо напісаць да яго некалькі слоў, ці чакаць яшчэ? Не хацела б я яго страціць.

Бася з Сакольшчыны

Бася! Як кажуць, „няма тае хаткі, каб не было звадкі». Па-мойму, тое, што адзін раз за столькі часу вы пасварыліся, не павінна парваць вашых сувязей. Спрэчка, відаць, не была ўжо такая сур'ёзная, калі Янэк абяцаў, што прыедзе да тваіх бацькоў уладжваць вясельныя справы, і не павінна яна пакінуць на вашых адносінах трывалага следу. Пісаць, мне здаецца, няма патрэбы. Хіба што бачыш у нечым сваю віну, дык тады напішы і перапрасі Янку. А калі ўжо Янка не адгукнецца, нічога не зробіш. У каханні бываюць і расчараванні. Але на пацішэнне дадам, што кожнае наступнае каханне, не бывае горшым ад папярэдняга.

Дык жадаю ўсяго найлепшага!

«Сэрцайка»

Згарэла старая царква

У пятніцу, 6 красавіка, познім вечарам узнік у вёсцы Клейнікі (Гайнаўскі павет) пажар, які знішчыў старую, драўляную царкву, пабудаваную ў 1880 г. Гэта царква была адным з прыгажэйшых гэтага тыпу аб'ектаў на Беласточчыне. У выніку пажару згарэлі таксама літургічныя рэчы і вартасныя іконы з XVII і XVIII стагоддзяў, якія былі ў царкве.

Як вынікае з уступных даследаванняў, прычынай пажару было кароткае замыканне электраўстаноўкі. Працу пажарных дружын ускладняў моцны вецер і адсутнасць праходу ў сярэдзіну гарэўшага аб'екта.

(ПАП)

Кансультацыя ЮРЫСТА

Пытанне: Дачка спадкадаўцы, якая пражывае ў горадзе, увесь час памагала бацьку, прысылаючы амаль штомесяц грошы і аплачваючы падаткі за гаспадарку. Бацька працаваць амаль не мог і гаспадарка была занядбаная. Быў у яго яшчэ сын, які пражываў у іншай вёсцы на сваёй гаспадарцы. Ці дачка можа атрымаць у спадчыне сельскую гаспадарку?

Адказ: Гаспадарку ў спадчыне могуць атрымаць толькі азначаныя законам асобы. Калі спадкадаўца пакінуў дзяцей, то яны могуць атрымаць сельскую гаспадарку, калі непасрэдна перад смерцю спадкадаўцы працавалі на гэтай гаспадарцы, былі членамі сельскагаспадарчага кааператыва, вялі іншую сельскую гаспадарку або працавалі на гаспадарцы сваіх бацькоў, мужа або жонкі, або бацькоў мужа або жонкі, былі непаўналетнімі, або вучыліся прафесіі ці хадзілі ў школу, былі трывала няздольнымі да працы, г. зн. інвалідамі І або ІІ групы або мелі: мужчына 65, а жанчына 60 год.

У даным выпадку гэтыя ўмовы споўнены толькі адносна сына. Дапамога бацькам з'яўляецца абавязкам маральным і на спадчынныя правы ўплыву не мае.

ВОСЬ ГЭТА ЗЯЦЬ!

Даражэнькія, як толькі Шурык прыехаў да мае Даміцэлькі сватацца, я спытала ціхенька ў свата, дзе ж гэты маладзік жыве і чым займаецца. Сват сказаў: — Занятак у яго той самы, што і заўсёды. У нашай вёсцы ёсць крама з півам, дык ён у гэтай краме заняты цэлы дзень. Абы снедаць маці навара, трошкі перакусіць і хутчэй у краму.

Я ўзрадавалася: Даміцэлька мая ўжо хоць цукеркаў пасмокча, бо яе Шурык у краме стаіць. Прыглядзелася я, а ён, як намаляваны. Я яшчэ мацней уцешылася са шчасця дачкі і хоць, праўда, заўважыла я, што пантофель нешта выкрыўлены і дзірачка ў шкарпетцы, але на гэта махнула рукою. Грунт, што прыгожы і мае занятак.

У чацвер я са сваім кумам Яськам Людвікавым паехала ў аглядзіны. Матуля зяцева нічога не ведала аб маім прыездзе. Сустрэла нас са слязьмі ў вачах ад радасці і кажа: „Каб Бог даў хутчэй яму ажаніцца, а то я амаль заўсёды сама, ён жа цэлымі днямі ў краме з півам. Каб была нявестка, то хоць пагаварыць было б з кім».

Хацела яна бегчы па Шурыка, але я не пусціла. Пайшла сама. Падыходзячы да крамы, уявіла, як Шурык мяне ў руку цалуе і шакалад суне. Яшчэ разважала, ці запытае, мо Даміцэлька разам прыехала, і тады яшчэ адзін шакалад з полкі. Адчыняю ў краму дзверы і бачу, што якаясь жанчына за буфетам, а мой зяцёк сядзіць на бочцы ад селядцоў з куфлікам у руцэ і ледзь вачыма хлопае. Хацеў сапраўды пацалаваць у руку, але пацалаваў у нагу, бо ўстаючы з бочкі так і пакаціўся на падлогу. Аб далейшым можаце ўявіць сабе самі.

Вось гэта зяць! Замест асалоды — горыч наляцела на маё сэрца, і мы з кумам, нават не зайшоўшы ў хату маладзіка, вярнуліся дамоў.

Так мая Даміцэлька па сённяшні дзень паненкаю і, знаеце, шчаслівей, чым з такім мужам, як Шурык.

Суседка Міхаліна



Ірэна Кузьма, ліцэй у Міхалове. Вершы нам вельмі спадабаліся і пусцім іх у „Парнасік“ без чаргі. Пішыце ў гэтым духу далей.

А. Ляўчук, Трашчоткі. Задума добрая, горш з яе выпаўненнем. Апрача грахоў фармальных (рыфма „сцены палаца“ і „вылятае з палаца“), ёсць і гістарычныя недакладнасці. У часе штурму Зімовага палаца не было ў ім цара. Ды і Чырвоная Армія створана была пазней. Парада адна: чытай добрыя вершы, ну, і падручніка па гісторыі не забывай.

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Кляшчэлі
„Kajtek i nowy braciszek“ (węgierski), 1-2. „Niech bestia zdycha“ (franc.), 3-4. „Początek nowego świata“ (rumuński), 5-6.

Нараўка
„Morderca jest w domu“ (węgierski), „Przygody psa Cywila“ (polski) 2-6.

Нарва
„Zaraza“ (polski), „Żandarm z gór“ (bułg.), 2-6.

Чыжы
„Trzecia część nocy“ (polski), „Kochany drapieżnik“ (radz.), 2-6.

Дубічы Царкоўныя
„Polonez Ogińskiego“ (radz.), „Ucieczka w milczenie“ (NRD), 2-6.

Арэшкава
„12 krzeseł“ (radz.), „Perła w koronie“ (polski), 5-6.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Боцькі
„Dzikie dziecko“ (franc.), „Dawid Copperfield“ (angl.), 2-6.

Орля
„Przygody psa Cywila“ (polski), „Milion lat przed naszą erą“ (angl.), 2-6.

Райск
„Agnieszka 46“ (polski), „Don Gabriel“ (polski), 2-6.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

Шудзялава
„Szerokiej drogi kochanie“ (polski), „Trzy kobiety“ (polski) 2-6.

Янаў
„Ocalenie“ (polski), 2-6.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц
„Popierajcie swego szeryfa“ (USA), „Księżniczka Czardasza“ (węgier.) 2-6.

Мельнік
„Gang Olsena“ (duński), „Powrót rewolwerowca“ (USA), 2-6.

„Daleko od słońca“ (jugosł.), 1-2, „Małżeństwo“ (franc.) 3-4, „Staroświecki dramat“ (radziecki), 5-6.

ДУБРОЎСКІ ПАВЕТ

Сухаволя
„Szklana kula“ (polski), „Dziewczyna na miotle“ (czeski), 2-6.

Новы Двор
„Umrzeć z miłości“ (franc.), „Bajka o zmarnowanym czasie“ (radziecki), 2-6.

Ніва

Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego. Wydawca: Białostockie Wydawnictwo Prasowe RSW „Prasa-Książka-Ruch“. Redaguje Kolegium. Adres Redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1. Numer przy przesyłkach pocztowych: Redakcja tygodnika „Niwa“, Skr. poczt. 281, 15-950 Białystok. Telefony: Redaktor Naczelny i Sekretarz Redakcji 2-10-33, publicyści 2-32-41 do 45 (centrala). **Cena prenumeraty krajowej: rocznie: 28,80 zł., półrocznie: 14,40 zł,** kwartalnie: 7,20 zł. Prenumeraty przyjmowane są do dnia 10 każdego miesiąca poprzedzającego okres prenumeraty. Prenumeraty na kraj dla czytelników indywidualnych przyjmują Urzędy Pocztowe oraz listonosze. Można również wpłaty na prenumeratę indywidualną dokonywać na konto I Oddziału Rejonowego „Ruch“ w Białymstoku 150-6-161 NBP I OM Białystok. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Wszystkie instytucje państwowe i społeczne w miastach, zamawiają prenumeratę wyłącznie za pośrednictwem Oddziałów i Delegatur RSW „Prasa-Książka-Ruch“. Pozostałe — mające siedzibę na wsi lub w innych miejscowościach, w których nie ma Oddziałów i Delegatur zamawiają prenumeratę za pośrednictwem Urzędów Pocztowych. Prenumeratę na zagranicę przyjmuje: RSW „Prasa-Książka-Ruch“ Biuro Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych, Wronia 23, 00-840 Warszawa. Konto PKO Nr 1-6-100024. Cena prenumeraty dla zagranicy jest wyższa od prenumeraty krajowej o 40%.

BZGraf. Nakład 8 202 K-1

Пачаў бачыць

Ён ішоў няроўнай зігзагападобнай паходкай па адной з цэнтральных вуліц горада. Арудуючы парасонам, як палкай, ён з цяжкасцю прабіваў сабе дарогу.

Ісці было нялёгка: ён сюд-туд натыкаўся на забалакаўшыхся прахожых, на ліхтарныя слупы, на кіёскі, ларкі...

Час ад часу ён звяртаўся да прахожых з просьбай перавесці яго праз дарогу.

Ён не бачыў спагадлівых позіркаў, якія за ім ляцелі, не чуў спачувальных уздыхаў прахожых...

Маладосць, модная вопратка, элегантныя туфлі яшчэ больш падкрэслівалі ўсю трагічнасць яго становішча.

Ды вось ён спыніў чарговага прахожага, папрасіўшы яго аб чымсьці, і той, узяўшы небараку за руку, правёў яго ў дзверы найбліжэйшай цырульні.

Праз 15—20 мінут ён з'явіўся на парозе цырульні. Пазбыўшыся модный капы валос, ён стаў яшчэ маладзейшым і сімпатычнейшым.

Сполах, здзіўленне, радасць, змяняючы адно аднаго, прабеглі па яго твары. Малады чалавек узняў рукі да неба і, голасна, на ўсю вуліцу крыкнуў: „Ура! Я бачу! Якое шчасце!" — кінуўся ў самую гушчыню гарадскога жыцця.

С. Мікалаеў

ПРАМОВА

„Таварышы! Сябры! Мы сышліся сюды, каб правесці ў апошні шлях нашага любімага, дарагога, незабыўнага Сямёна Кузьміча, чалавека рашучага і сумленнага, чулага і надта смелага. Нягледзячы на свае 23 гады, ён даказаў, што з'яўляецца самым стальным сяродд нас і самым сур'ёзным.

Дарагі наш таварыш! Сябрук! Не доўга ты з намі жыў, але слаўна! Шмат чаго не паспеў здзейсніць, што задумаў, але зроблена не мала.

Дазволь жа мне ад імя тваіх верных сяброў сказаць: „Бывай, дружбак! Даруй, што мы цябе не ўберагілі!".

Сямён Кузьміч... пацалаваў нявесту, падняў на рукі і панёс у расквечаную „Волгу". Вясельны картэж машын імкліва накіраваўся ў рэстаран „Зара", дзе госці з нецярпеннем чакалі шчаслівых маладых і іх сяброў.

Віктар Шаўчэнка

ПРЫЧЫНА

Экзаменатар пытае будучага настаўніка:

— Скажыце, чаму вы выбралі сабе гэту прафесію? Назавіце хоць тры прычыны?

— Калі ласка: чэрвень, ліпень, жнівень.

— *Бацька! Хто тут заказваў пясок?*

НІЎКА

ПЯТАЕ КОЛА

Едзе Воз, а на дарозе ляжыць Кола.

— Вазьмі і мяне, — гаворыць Кола, — прыдамся.

— Кацiся, — праскрыпеў Воз, — навошта возу пятае кола?

І паехаў, і паехаў... і на першай ухабіне зламаў кола... а замяніць няма чым.

Мараль: усе прапісныя ісціны добрыя, але толькі да першай ухабіны.

ГУМАР З...

ДАПЁК

У хаце, якая засталася пасля смерці бацькоў, жылі два браты Грыц і Карп. Браты вельмі дрэнна з сабою жылі і амаль кожны дзень сварыліся. Аднойчы дасварыліся да таго, што Грыц улез на страху, падпаліў ды й крычыць:

— Карп, гасі сваю палавіну, бо я сваю палю. Пайду жыць да цёшчы, а ты яе не маеш.

МІНІВЕРШЫ

ШУКАЛЬНІК

Шукае дужа маладуху,
Хоць у целе мала духу.

У. Скарынкін

СКАРГА КАТА

Ва ўсе інстанцыі ён піша,
Што хвост яму адгрызлі мышы.

СМЯЛЬЧАК

Ён смела браў быка за рогі,
Калі той не ўставаў на ногі.

П. Шыбут

Талаваломка

2	1	2	3	2	1	2	3
1	3	1	1	2	3	1	2
2	1	3	2	3	1	3	1
3	2	1	2	2	3	1	2
1	3	2	1	3	2	1	1
2	1	3	2	1	3	2	3
1	1	2	1	2	2	3	1
3	2	1	2	3	1	1	2

Пад адным з каменняў,назначаных цыфрамі, знаходзіцца скарб. Аб тым, як знайсці яго, напісана ў старажытным пергаменце:

„Скарб знаходзіцца пад каменем з нумарам І, які размешчаны ўнізе каменя 2, а гэты камень знаходзіцца справа ад каменя 3. Апошні размешчаны над каменем 2, а той, у сваю чаргу, знаходзіцца злева ад каменя І".

Пад якім жа каменем знаходзіцца скарб?

* * *

Адказ на заданне з папярэдняга нумара:

3 м
3 м
2 м
3,5 м

СЫТЫ ГАЛОДНАГА

Галодны воўк хацеў з'есці сытага зайца... А заяц не хацеў.

Сыты галоднага не разумее.

М. Азаў, У. Ціхвінскі

...Ён усё жыццё марыў абысці ўвесь свет і стаў... прайдзісветам.

...Ён у вёску да бацькоў ніколі не прыязджаў з пустымі рукамі — з ім заўсёды была сумка.

НЯЎДАЧНІЦА

Пан Маліноўскі спытаў аднойчы ў пані Кавальскай:

— Колькі булак вы можаце з'есці на пусты жалудак?

— Чатыры, — адказала Кавальская.

— Гэта немагчыма.

— Чаму?

— Таму, што, калі вы з'ясце першую булку, жалудак ужо не будзе пустым.

— Дасканалы анекдот! — усклікнула Кавальская і тут жа пабегла да прыяцельніцы.

— Колькі булак ты можаш з'есці на пусты жалудак?

— Пяць, — адказала яна.

— Вельмі дрэнна, — сказала Кавальская панура.

— Чаму ж? — здзівілася прыяцельніца.

— Таму, што, калі б ты сказала, што чатыры, я б расказала табе дасканалы анекдот.

У МАРСЕЛІ

Парыжанін прыехаў у Марсель і ўзяў таксі. Праз нейкі час гаворыць шафёру:

— Вы прыкмецілі, што забілі ўжо чатырох пешаходаў?

— Вы, уласна, прыехалі ў Марсель як турыст ці як статыстык?

Дапамаглі.

ШКАДА — ШКАДА...

Некаторыя кіраўнікі даведваюцца аб стане здароўя сваіх кадраў па чорнай рамачцы на апошняй старонцы газеты.

— Гэта ж трэба, Пятроўскі памёр! Справы, га? А я акурат збіраўся на калегіі яму добра ўсыпаць. Ён жа ж да гэтых пор за першы квартал справаздачы не здаў. Гм — так, шкада, шкада...

АПОШНЯЯ ФРАЗА

Двое аднача́сова прыбываюць у рай. Адзін пытае другога.

— Якую апошнюю фразу вы чулі на зямлі?

— Гэта была фраза маёй жонкі.

— І што ж яна сказала?

— Мілы, ты будзеш проста анёлам, калі на хвіліну перадасі мне руль.

НЕ НА АДПАЧЫНАК

Зазваніў тэлефон. Трубку ўзяў пяцігадовы хлопчык.

— Вам каго? — спытаў.

— Тата дома? — пачулася з трубкі.

— Не, няма, — адказаў малы, — некуды паехаў.

— На адпачынак?

— Ды не, ён паехаў з мамай...

НЕ КАЖЫ ГОП...

П'яны мужчына кінуўся на шыю сторажу радзільнага дома:

— Панове, у мяне блізняты!

— Добра, добра! — усміхаецца сторож. — Але чаму вы кажаце „панове", калі я тут адзін?

— Адзін? — здзівіўся новаспечаны бацька. — Вось як?.. Дык я збегаю назад, пагляджу, ці сапраўды блізняты...

ДОКАЗ

Размаўляюць двое старых:

— Ведаеш, — гаворыць адзін, — я моцны, як у маладосці.

— Як ты гэта выявіў?

— Вельмі проста. Бачыш тыя старыя млынавыя жорны на беразе ракі? Калі мне было 18 год, я не мог зрушыць іх з месца і цяпер таксама не магу.

Курёзы

ВЯРТАННЕ НАТАШЫ КУЧЫНСКАЙ

Усім аматарам спорту добра вядома імя Наташы Кучынскай. Яе бліскучыя перамогі на розных спаборніцтвах сталі гісторыяй. Тэмпераментныя мексіканцы назвалі савецкую гімнастку дачкой Мексікі.

Пасля Алімпійскіх гульняў у Мехіка траўмы праследавалі Кучынскую. І дзяўчына раптам страціла веру ў сваю спартыўную зорку, перастала трэніравацца. Яна проста баялася снарадаў.

Прайшло некалькі гадоў. І вось зусім нядаўна імя Кучынскай зноў з'явілася ў судзейскіх пратаколах. Славутая гімнастка захапілася... скачкамі ў ваду. Трэнер не без падстаў лічыць, што на вышцы вучаніца дасягае тых жа вышынь, што і на гімнастычным памосце.

Магчыма гэта так і будзе, і тады мы станем сведкамі другога спартыўнага жыцця Наташы Кучынскай.

НАСЛУХАЎШЫСЯ ЛЕКЦЫЙ

У амерыканскай ваеннай акадэміі Вест-Пойнт паніка. Яна ахапіла ўсіх — ад ветэранаў-педагогаў, у якіх шмат узнагарод за храбрасць, да зялёных слухачоў, якія яшчэ не ведалі страху. Віноўнік панікі — здань. Часопіс „Тайм" вельмі сур'ёзна паведамляе, што многія слухачы бачылі ля пакоя № 4714 здань салдата ва ўніформе часоў прэзідэнта Джэксана і з мушкетам у руках. Капітан Кейт Бэкен, які вырашыў паклаcці канец гэтым панічным чуткам, пасля адпаведнай праверкі... прызнаў факт з'яўлення здані. Месца, дзе яна знікла, дадаў капітан, было навобмацак ледзяное. Бэкен забараніў уваходзіць у пакой № 4714 да вялікадня 1974 года.

Смяёмся з намі

Ніколі не спрачайся з жанчынай, нават калі яна сто разоў мае рацыю.